МІТРАПАЛІТ ВЕНІЯМІН — ПРА СВЯТА І НЕ ТОЛЬКІ **4–5**

КАНФЕСІЙНЫ КАЛЯНДАР — 2022 **8, 17**

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

6 СТУДЗЕНЯ 2022 г. ЧАЦВЕР № 3 (29625)

ЦЫТАТА ДНЯ

Ігар ЛУЦКІ, намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта:

«Нязменны пастулат — захаванне ідэнтычнасці, і ў гэтай справе няма найлепшага дарадцы, чым гісторыя і Вялікая Перамога. 2020 год адкрыў нам вочы на нашы памылкі і ідэалагічныя пралікі, 2021-ы дазволіў вызначыць шляхі абароны дзяржаўнага суверэнітэту, адзін з якіх — шырокамаштабная работа па замацаванні дакладных гістарычных фактаў у масавай свядомасці беларусаў. Мы ўстанавілі дзяржаўнае свята — Дзень народнага адзінства, прынялі шэраг заканадаўчых актаў, накіраваных на абарону нашага гістарычнага мінулага і выключэнне любых форм не толькі прапаганды, але і апраўдання дзеянняў нацыстаў і іх прыслужнікаў».

КАРАТКА

- **Генеральны пракурор Беларусі Андрэй Швед накіраваў у Савет Міністраў інфармацыю з канкрэтнымі прапановамі па ўвекавечанні памяці ахвяр генацыду беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны.**
- І Міжнародная выстава «Нацыянальная бяспека. Беларусь-2022» пройдзе ў чэрвені.
- **Больш за 3,8 млн беларусаў прайшло поўны курс вакцынацыі супраць COVID-19.**
- Колькасць наведвальнікаў Нясвіжскага музейнага комплексу ў 2021 годзе павялічылася амаль на трэць. Асноўны прыток гасцей забяспечылі беларусы, якія значна часцей прыязджалі ў музей-запаведнік.

ISSN 1990 — 763X

ЖАДАНАЕ СВЯТА РАСТВА

Праваслаўным хрысціянам Беларусі

Дарагія суайчыннікі!

Ад усёй душы віншую са светлым святам Раства Хрыстова!

Вялікае таінства гэтых урачыстых калядных дзён пранікнута неспасціжнай глыбінёй і высокім сэнсам, і мы заўсёды з нецярпеннем і радасцю чакаем гэтыя шчаслівыя цудоўныя імгненні, калі па-асабліваму ўспрымаюцца такія простыя чалавечыя пачуцці, як міласэрнасць і спачуванне, самаадданасць і цярплівасць.

Гэтае свята мы заўсёды сустракаем пад мелодыю званоў у коле сям'і. Дзелімся добрымі думкамі і пачуццямі з роднымі і блізкімі. Менавіта іх любоў і падтрымка дапамагаюць нам пераадольваць цяжкасці, умацоўваюць веру ў свае сілы і даюць упэўненасць у заўтрашнім дні.

Няхай жаданае свята Раства ўвойдзе ва ўсе нашы дамы і прыўнясе ў жыццё кожнага беларуса радасць і шчасце. Міру, дабра, дабрабыту і здароўя вам і вашым блізкім.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.



Брама-званіца царквы Праабражэння Гасподняга ў Лепелі.

Фота Анатоля КЛЕЦКУКА.

«ЧАРОЎНАЯ ДАРОГА» ДА ПАЛАЦА НЕЗАЛЕЖНАСЦІ

Інтэрактыўныя навагоднія паказы «Чароўная дарога» праходзяць 5 і 6 студзеня ў рамках дабрачыннай акцыі «Нашы дзеці» па даручэнні кіраўніка дзяржавы. На свята ў рэзідэнцыю Прэзідэнта запрошаны дзеці з усіх абласцей і Мінска, усяго амаль 1000 гасцей.

Маленькіх беларусаў сустракаюць у Палацы Незалежнасці казачныя героі, персанажы мультфільмаў і галоўны сімвал гэтага года — Тыгруля. Яны запрашаюць гасцей у «Майстэрні чараўнікоў», дзе тыя могуць зрабіць хэнд-мэйд-паштоўкі, ёлачныя цацкі, стыкеры, калядныя свечкі, драўляныя цацкі. Арганізаваны і разнастайныя забаўкі — сэлфі-люстэрка, неонавы тунэль, пінарт-сцяна.

Кульмінацыя навагодняга свята — інтэрактыўны спектакль «Чароўная дарога», гледачы якога таксама сталі яго героямі. Пра сюжэт казкі журналістам расказала **галоўны рэжысёр навагодняга прадстаўлення Уладзіслава АРЦЮКОЎСКАЯ.** Галоўныя героі — маладыя хлопец і дзяўчына, якія пераадольваюць цяжкасці і трапляюць у Снежнае царства Дзеда Мароза.

СТАР. 2

Фота БелТА.

«ЧАРОЎНАЯ ДАРОГА» ДА ПАЛАЦА НЕЗАЛЕЖНАСЦІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«Мы так прыдумалі навагодні паказ, каб дзеці самі сталі яго ўдзельнікамі. Яны разгадваюць загадкі, гуляюць у снежкі, калядуюць з артыстамі, засвойваючы народныя традыцыі, прыказкі і прымаўкі», — дзеліцца Уладзіслава Арцюкоўская.

Яна неаднойчы арганізоўвала Венскі баль у Палацы, а навагодні паказ для дзяцей рэжысіравала ўпершыню. «Калі прыходзяць студэнты, тры месяцы з імі трэніруешся, каб яны засвоілі бальную культуру, — гэта хвалюючае. А рабіць свята для дзяцей асабліва хвалюючае, бо малыя наіўныя і вераць у цуд», — адзначыла рэжысёр.

Галоўны балейтмайстар маладзёжнага балю Святлана Гуткоўская таксама прызнаецца, што ў навагодняга свята для дзяцей. Гэта навагодняя казка, расказала яна, кароткая — усяго гадзіна і пятнаццаць хвілін, але маштабная па колькасці задзейнічаных артыстаў і падрыхтоўцы. Толькі балет складаецца з 80 чалавек. Для казкі спецыяльна шылі касцюмы, пісалі музыку і песні.

«Назва вельмі трапная — «Чароўная дарога». Гэта дарога дабра, любові, дарога, па якой дзеці ідуць, вывучаючы традыцыі нашага народа. Тут шмат інтэрактыву, выразных сродкаў з розных відаў мастацтва — відэакантэнт, песенная творчасць, харэаграфія. Шмат у паказе занята дзіцячых і дарослых творчых калектываў, знакамітых беларускіх акцёраў, цыркавых артыстаў. Я думаю, дзеці атрымаюць задавальненне і ў іх будзе шмат уражанняў», — заўважае Святлана Гуткоўская.

Асноўныя госці Палаца Незалежнасці ў гэтыя дні — дзеці-сіроты, дзеці з малазабяспечаных сем'яў, выдатнікі вучобы і актывісты з усёй краіны. Напрыклад, **Таццяна КУЛЕШ, метадыст Гродзенскага раённага вучэбна-метадычнага кабінета, прадстаўнік органаў апекі і папячыцельства Гродзенскага райвыканкама,** суправаджала ў Мінск дзелегацыю з Гродзеншчыны з 46 дзяцей.

«Пэўны час малыя не ведалі, куды мы іх вязём, у іх былі толькі здагадкі. Я расказала, што мы едзем у Палац Незалежнасці, дзе працуе Прэзідэнт. І калі наша мерапрыемства будзе ісці, побач будзе працаваць кіраўнік дзяржавы. Дзеці не паверылі, бо ўзяць удзел у такім маштабным свяце для іх — найлепшае, што магло адбыцца ў пачатку года», — расказвае суразмоўніца.

Ад беларускага лідара госці атрымаюць салодкія падарункі, а ў адказ падрыхтуюць фотаальбом. Імгненныя фотаздымкі робяцца на «паляроід», падпісваюцца і ўклейваюцца ў альбом, які пасля перададуць Прэзідэнту.

Марыя ДАДАЛКА.

Што ў свеце робіцца

Хваляванні ў Казахстане

Працэсы, якія адбываюцца ў гэтай краіне, будуць мець далёка ідучыя наступствы для ўсёй Еўразіі

Сітуацыя ў Казахстане працягвае заставацца напружанай. Учора ўдзельнікі пратэсту ў Алматы ўварваліся ў будынак акімата (мясцовая адміністрацыя). Пра гэта паведамляе «Sputnik Казахстан».

Як перадае карэспандэнт выдання, унутры знаходзяцца супрацоўнікі паліцыі. І сілавікі, і пратэстоўцы выкарыстоўваюць святлошумавыя гранаты. Удакладняецца, што пратэстоўцы абараняюцца шчытамі і палкамі. Іншая частка натоўпу спрабуе трапіць у старую рэзідэнцыю прэзідэнта Казахстана.

Раней паведамлялася, што раніцай 5 студзеня ўдзельнікі пратэстаў у іншым казахстанскім горадзе, Актабэ, захапілі будынак акімата.

2 студзеня жыхары гарадоў Жанаазен і Актау ў Мангістаўскай вобласці масава выйшлі на вуліцы з заклікам знізіць цэны на паліва. Паводле іх слоў, з 1 студзеня цана за літр звадкаванага газу ўзрасла да 120 тэнге ($0,27), дэманстранты патрабавалі знізіць яе да 50-60 тэнге ($0,11-0,13). Прэзідэнт даручыў ураду тэрмінова разгледзець сітуацыю ў рэгіёне з улікам эканамічнай мэтазгоднасці і ў прававым полі. Урадавая камісія прыбыла ў Актау і прыступіла да работы. У аўторак пасля сустрэчы з пратэстоўцамі камісія аб'явіла аб зніжэнні цаны на звадкаваны газ да 50 тэнге за літр у Мангістаўскай вобласці.

Тым не менш 4 студзеня на Плошчы Рэспублікі ў Алматы адбыліся сутыкненні пратэстоўцаў з сілавікамі. Праваахоўнікі ўжывалі для разгону пратэстаў слёзатачывы газ і святлошумавыя гранаты. У Алматы і ў Мангістаўскай вобласці ўвялі рэжым надзвычайнага становішча да 19 студзеня, у перыяд дзеяння рэжыму аб'яўлена камендантская гадзіна з 23.00 да 7.00.

На фоне пратэстаў прэзідэнт Казахстана Касым-Жамарт Такаеў адправіў урад краіны ў адстаўку, а таксама даручыў увесці дзяржрэгуляванне цэн на звадкаваны газ, бензін, дызель і сацыяльна значныя прадукты тэрмінам на 180 дзён.

Учора ўвечары паступілі паведамленні, што ў Алматы пратэстоўцы штурмавалі будынак Аўэзаўскага РАУС. СМІ таксама інфармуюць аб выпадках марадзёрства і рабавання банкаматаў. З аэрапорта ў Алматы ўжо эвакуіравалі супрацоўнікаў. Аэрапорт Алматы захоплены пратэстоўцамі, паведамляе Orda.kz. Тым часам кіргізскія СМІ ўжо паведамляюць, што самалёт зяця Назарбаева Цімура Кулібаева вылецеў у Кіргізію.

Учора ўвечары з'явілася паведамленне аб тым, што Аляксандр Лукашэнка правёў тэлефонныя размовы з Уладзімірам Пуціным і Касым-Жарматам Такаевым.

Падобная сітуацыя была ў 2020 годзе ў Беларусі. Калі б не моцная палітычная воля кіраўніка краіны, усё магло б скончыцца, як учора ў гарадах Казахстана, — гібеллю сілавікоў, падпалам адміністрацыйных будынкаў, разгромам крам і банкаў.

За сітуацыяй у Казахстане пільна назіраюць палітыкі і эксперты. «На вуліцы лёс Казахстана вырашацца не павінен, заявіў карэспандэнту БелТА **дэпутат Палаты прадстаўнікоў, старшыня Ліберальна-дэмакратычнай партыі Беларусі Алег ГАЙДУКЕВІЧ.** Паводле яго слоў, насцярожвае тое, што спачатку ў Казахстане былі толькі эканамічныя патрабаванні, а цяпер ужо там пачынаюць выкарыстоўваць метадычкі каляровых рэвалюцый, якія выкарыстоўваліся на ўсёй постсавецкай прасторы. «Не бывае добрых рэвалюцый, не бывае добрай вуліцы. На мой погляд як палітыка, улада Казахстана павінна жорстка спыняць любыя спробы вырашэння пытанняў на вуліцы, арганізатараў — прыцягваць да адказнасці ў рамках закона, — сказаў Алег Гайдукевіч. — А людзям тлумачыць, што на вуліцы нічога ніколі не вырашыцца, што трэба рухацца толькі нармальным чалавечым шляхам, шляхам дыялогу ўсё вырашаць».

Па словах дэпутата, падзеі ў Казахстане, як і ў Беларусі ў свой час, разгортваюцца па адной і той жа схеме. «І яшчэ адзін момант геапалітычны. Трэба цудоўна разумець, што Казахстан вельмі важны для Захаду. Расхістаць там сітуацыю, таму што гэта ключ да Кітая і Расіі. Ніколі не было ні адной паспяховай вуліцы, якая не падтрымлівалася б звонку, — адзначыў ён. — Я назіраю з трывогай за сітуацыяй у Казахстане: гэта наш саюзнік па ЕАЭС, гэта краіна, дзе нам хацелася б, каб заўсёды былі стабільнасць, парадак і закон.

Загадчык аддзела сацыялогіі дзяржаўнага кіравання Інстытута сацыялогіі НАН Беларусі, кандыдат філасофскіх навук Мікалай ШЧОКІН лічыць, што ўсё, што цяпер адбываецца ў Казахстане, з'яўляецца паслядоўнай палітыкай ЗША па падрыве рэгіянальнай стабільнасці і ўдушэнні СНД, а таксама па тарпедаванні Еўразійскага праекта.

«Дзеля справядлівасці трэба адзначыць, што Аляксандр Лукашэнка яшчэ перад Новым годам, выходзячы з вопыту Беларусі, на пасяджэнні АДКБ і саміце СНД перасцерагаў кіраўнікоў краін СНД ад магчымых сцэнарыяў», — адзначыў аналітык.

Мікалай Шчокін падкрэсліў: беларускі народ з трывогай і надзеяй успрымае тое, што адбываецца. «Еўразійская бяспека пад рэальнай пагрозай, — дадаў ён. — У любым выпадку працэсы, якія адбываюцца ў Казахстане, будуць мець далёка ідучыя наступствы для ўсёй Еўразіі».

ДАСЛОЎНА

Анатоль ГЛАЗ, прэс-сакратар МЗС Беларусі:

«Вядома, нам неабыякава тое, што адбываецца гэтымі днямі ў Казахстане. Гэта блізкая нам краіна, наш саюзнік, таму мы ўважліва і з занепакоенасцю адсочваем сітуацыю. Больш за тое, і па змесце, і па форме падзеі нам знаёмыя. Механізмы і інструменты відаць простым вокам. У сувязі з гэтым на дадзеным этапе лічым важным стабілізаваць сітуацыю і спыніць беспарадкі. Спадзяёмся, што казахстанскае кіраўніцтва з гэтым справіцца. Гісторыя пераканаўча даказала, што шлях пераваротаў і рэвалюцый ні да чога добрага не прыводзіць».

ДЗЕЯННІ НЕ ПАДДАЮЦЦА РАЗУМЕННЮ...

Супрацоўнікі генконсульства Польшчы ў Брэсце арганізавалі спробу ўцёкаў з Беларусі падазраванага ў смяротным ДТЗ

Смяротная аварыя адбылася перад Новым годам, вечарам 30 снежня. Як расказаў афіцыйны прадстаўнік упраўлення Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь па Брэсцкай вобласці Руслан Зармаеў, 22-гадовы грамадзянін Польшчы Пшэміслаў Збуцкі, кіруючы аўтацягніком «Вольва», рухаўся па трасе «Брэст — Мінск — граніца РФ». На 160-м км аўтадарогі пры перастраенні аўтацягніка ў левую крайнюю паласу руху адбылося сутыкненне з аўтамабілем Lada Granta, які рухаўся ў спадарожным напрамку, пад кіраваннем 29-гадовай жыхаркі Жабінкі.

У выніку дарожна-транспартнага здарэння пасажыры легкавога аўтамабіля дзве маладыя жанчыны, адной з якіх 31 год, другой — 35, ад атрыманых траўмаў памерлі на месцы. Кіроўца 1992 года нараджэння дастаўлена ў Івацэвіцкую бальніцу з пераломам рукі і чэрапна-мазгавой траўмай. Машына ў таго боку, на які наехала польская фура, была літаральна спляскана ў блін.

Па факце ДТЗ узбуджана крымінальная справа. Да падазраванага Пшэміслава Збуцкага была прыменена мера працэсуальнага прымусу ў выглядзе часовага абмежавання права на выезд з Рэспублікі Беларусь, аб чым яму даведзена ў пісьмовай форме — пад роспіс. Бацька — Яраслаў Януш Збуцкі — сумесна з іншаземцам прызнаны сведкам па крымінальнай справе.

Але ўвечары 3 студзеня няўдалы кіроўца разам са сваім бацькам заехаў у пункт пропуску «Брэст» на рэйсавым аўтобусе Санкт-Пецярбург — Варшава. Мужчыны мелі намер пакінуць краіну. Пры правядзенні пагранічнага кантролю было выяўлена, што маладому чалавеку абмежаваны выезд з Беларусі. Сам замежнік заявіў, што нібыта не ведае пра прычыну гэтай забароны, расказаў афіцыйны прадстаўнік Дзяржпагранкамітэта Антон Бычкоўскі. Пасля, калі высветлілася, у чым падазраваецца парушальнік, малады чалавек прызнаўся, што з выездам у Польшчу яму дапамаглі супрацоўнікі польскага генконсульства ў Беларусі. «Яны набылі яму білет да месца жыхарства ў Польшчы, прывезлі на аўтавакзал і суправадзілі да аўтобуса», — адзначыў афіцыйны прадстаўнік ДПК.

Замежны грамадзянін перададзены супрацоўнікам Следчага камітэта для далейшага разбіральніцтва. А дзеянні польскіх дыпламатаў атрымалі адэкватную рэакцыю ад беларускага знешнепалітычнага ведамства.

У Міністэрства замежных спраў быў выкліканы часовы павераны ў справах Польшчы ў Беларусі, паведаміў прэс-сакратар МЗС Анатоль Глаз, які назваў тое, што здарылася, «абуральным выпадкам». «Намі дакладна ўстаноўлена, што спробу ўцёкаў ініцыіравалі і арганізавалі супрацоўнікі генеральнага консульства Польшчы ў Брэсце, — заявіў ён. — Больш за тое, рабілі гэта свядома, разумеючы і абгрунтаванасць абмежаванняў на выезд для падазраванага, і тое, што ў выніку ДТЗ два чалавекі загінулі».

Па сутнасці, супрацоўнікі польскага консульства наўмысна штурхалі свайго грамадзяніна на парушэнне беларускага заканадаўства і выракалі яго на наступны міжнародны вышук у сувязі з ДТЗ, якое прывяло да смерці людзей, звярнуў увагу Анатоль Глаз.

Прэс-сакратар знешнепалітычнага ведамства адзначыў, што такія дзеянні супрацоўнікаў генконсульства Польшчы прама парушаюць палажэнні Венскіх канвенцый аб дыпламатычных і консульскіх зносінах і парушаюць беларускае заканадаўства — гэтак жа, як парушалі б і законы любой іншай краіны. «Яны таксама не паддаюцца разуменню з пункту гледжання высокага звання консула або дыпламата. Па сутнасці, гэта службовая асоба, якая заклікана быць прыкладам законнасці і якая мае права, напрыклад, наведваць закрытыя або пенітэнцыярныя ўстановы. І гэтая службовая асоба сама свядома парушае закон. Тым больш што ў дадзеным выпадку размова ідзе аб гібелі людзей», — дадаў Анатоль Глаз.

У беларускім МЗС выказалі надзею, што здарэнне — адзінкавы выпадак, які не характарызуе работу знешнепалітычнага ведамства Польшчы ў цэлым. «Разам з тым мы не бачым магчымасці для прадаўжэння работы гэтага консульскага супрацоўніка на тэрыторыі Беларусі. Аб інцыдэнце мы праінфармуем нашых замежных партнёраў. Разлічваем, што нашымі польскімі калегамі будуць зроблены адпаведныя высновы», — рэзюмаваў дыпламат.

Блізкая ўлада

ВЫКАНКАМЫ НА СУВЯЗІ І Ў НОВЫМ ГОДЗЕ

Практыка правядзення прамых ліній рэгіянальнай «вертыкаллю» працягваецца. Калі ў вас ёсць пытанні або праблемы, якія патрабуюць умяшання органаў улады, тэлефануйце.

Тэлефонныя лініі ў суботу, **8 студзеня,** з 9.00 да 12.00 правядуць:

• першы намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Валянцін Міхайлавіч ЗАЙЧУК. Тэл. 8 016 221 31 21;

• намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Барыс Сяргеевіч ЯФРЭМАЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;

• намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Андрэй Анатольевіч БАРАНОЎСКІ. Тэл. 8 023 233 12 37;

• намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Віктар Францавіч ПРАНЮК. Тэл. 8 015 273 56 44;

• намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Сяргей Мікалаевіч МАСЛАЎ. Тэл. 8 022 250 18 69;

• намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Аляксандр Уладзіміравіч КРУЧАНАЎ. Тэл. 8 017 500 41 60;

• першы намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама Дзмітрый Міхайлавіч МІКУЛЁНАК. Тэл. 8 017 222 44 44.

«ПАТЭНЦЫЯЛ МОЛАДЗІ ПАВІНЕН БЫЦЬ СКІРАВАНЫ НА ІНТАРЭСЫ ГРАМАДСТВА І ДЗЯРЖАВЫ»

У новы год — з новымі праектамі. Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі пачынае серыю адкрытых дыялогаў «Сіла Закона». Галоўная мэта праекта — даць моладзі магчымасць выказаць сваё меркаванне наконт праекта змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю Беларусі, унесці свае прапановы. Першая вялікая дыскусійная пляцоўка адкрылася ўчора ў вельмі сімвалічным для такога праекта месцы — Канстытуцыйным Судзе Рэспублікі Беларусь.

Маладыя, актыўныя, ініцыятыўныя людзі сабраліся разам, каб абмеркаваць змяненні і дапаўненні ў Асноўны Закон краіны, вызначыць, якую ролю адыгрывае моладзь у гэтым гістарычным этапе развіцця краіны. Выказацца на актуальную тэму сабралася больш за 200 чалавек з усёй краіны. Прадстаўнікі рэгіёнаў удзельнічалі ў мерапрыемстве анлайн. Да іх далучыліся прадстаўнікі Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў, Нацыянальнага цэнтра прававой інфармацыі, дэпутацкага корпуса.

Галоўным спікерам і экспертам маладзёжнай дыскусіі выступіў **старшыня Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь, заслужаны юрыст Беларусі, старшыня Канстытуцыйнай камісіі Пётр МІКЛАШЭВІЧ.**

«Моладзь — найбольш актыўная і крэатыўная частка грамадства. Інтэлектуальны, духоўна-маральны патэнцыял моладзі, яе актыўная жыццёвая пазіцыя абумоўлівае далейшае прагрэсіўнае ўстойлівае развіццё грамадства і дзяржавы. У змяненнях Канстытуцыі прадугледжаны новы асобны артыкул, які ўстанаўліваe, што дзяржава садзейнічае ўсебаковаму развіццю моладзі, стварае неабходныя ўмовы для яе актыўнага ўдзелу ў грамадскім жыцці. Пры гэтым патэнцыял моладзі павінен быць скіраваны на інтарэсы грамадства і дзяржавы, — адзначыў ён. — Як старшыня Канстытуцыйнай камісіі, я заклікаю моладзь узяць актыўны ўдзел у гістарычна важнай падзеі — абмеркаванні і прыняцці абноўленай Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. Па гэтай Канстытуцыі вам жыць і працаваць, рэалізоўваць правы чалавека і грамадзяніна, абараняць радзіму, уладкоўваць і развіваць нашу краіну». Пётр Міклашэвіч выказаў упэўненасць, што маладыя грамадзяне краіны, якія маюць выбарчае права, прымуць актыўны ўдзел у рэферэндуме 14 студзеня — у сталіцы і Мінскім раёне. Акрамя таго, на сайце brsm.by працуе анлайн-прыёмная. Праз яе любы грамадзянін краіны можа ўнесці прапановы па праекце змяненняў і дапаўненняў у Асноўны Закон. Саюз моладзі акумулюе ўсе прапановы і ва ўстаноўленым парадку накіруе ў НЦПІ.

«Моладзь ініцыятыўная, і сёння моладзі важна, каб яе голас пачулі. Гэта гістарычны шанц для нашых маладых людзей прыняць асабісты ўдзел у будаўніцтве будучыні нашай краіны. Вельмі прыемна адзначыць, што ў рамках адкрытага дыялогу маладыя людзі выступілі з ініцыятывай правесці знакавы рэспубліканскі праект, прысвечаны ролі асобы ў гісторыі, «Лідар нацыі». Праект будзе прадстаўляць шэраг творчых ініцыятыў па апісанні лідара нацыі. І вельмі знакава, што менавіта моладзь прасоўвае такія ініцыятывы», — падкрэсліў **першы сакратар Цэнтральнага камітэта БРСМ Аляксандр ЛУК'ЯНАЎ.**

Падчас дыскусіі ўдзельнікі сышліся на думцы, што новая канстытуцыйная норма, якая датычыцца моладзі, закладзе аснову канструктыўнага ўзаемадзеяння маладых людзей і грамадства. А Пётр Міклашэвіч звярнуў увагу, што гэтая норма дазволіць моладзі ўсебакова развівацца і годна адказваць на ўсе выклікі часу, а дзяржаве — уцягваць моладзь у вырашэнне важных грамадскіх і дзяржаўных задач, выхоўваць маладых патрыётаў, адказных за сучаснасць і будучыню краіны.

«Падобныя мерапрыемствы даказваюць і паказваюць, што моладзь чуюць. І гэта вельмі добра. Моладзь, як ніхто іншы, можа актыўна прапаноўваць ідэі і рэалізоўваць іх у жыццё. Тое, што нас запрашаюць на дыялогавыя пляцоўкі, да нашага меркавання прыслухоўваюцца, дарагога варта. Мы жывём у гістарычны момант, калі прымаюцца змяненні і дапаўненні ў Канстытуцыю. Цяпер я, малады выкладчык, магістрант, усё гэта назіраю. А гадоў праз 10 змагу сказаць сваім студэнтам, што я меў дачыненне да такой важнай падзеі ў жыцці нашай краіны і расказаць, як усё было на самай справе», — падзяліўся меркаваннем выкладчык факультэта журналістыкі БДУ Максім Цюцянькоў.

Валерыя СЦЯЦКО.
Фота БелТА.

Прыходзьце з прапановамі!

Наталля КАЧАНАВА возьме ўдзел у рабоце грамадскай прыёмнай пры Савеце Рэспублікі

Спікер верхняй палаты парламента ў панядзелак, 10 студзеня, будзе прымаць грамадзян, у якіх ёсць прапановы па праекце Асноўнага Закона нашай краіны. У гэты ж дзень з заяўнікамі таксама сустрэнецца віцэ-спікер Савета Рэспублікі Леанід ЗАЯЦ.

Нагадаем, што з серады, 5 студзеня, пачала дзейнічаць грамадская прыёмная пры Савеце Рэспублікі па абмеркаванні змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь. Члены Савета Рэспублікі гатовыя выслухаць усіх, у каго ёсць прапановы па праекце Асноўнага Закона, і адказаць на іншыя пытанні, якія хвалююць грамадзян, кожныя панядзелак, сераду і пятніцу з 11.00 да 17.00 па адрасе: г. Мінск, вул. Кірава, 47.

У дзень адкрыцця, напрыклад, сустрэчу з грамадзянамі па абмеркаванні змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю праводзілі старшыні пастаянных камісій: у першай палове дня — **па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей РАЧКОЎ**; у другой — **па адукацыі, культуры, навуцы і сацыяльным развіцці Віктар ЛІСКОВІЧ.**

Вядома ж, колькасць жадаючых трапіць на прыём да спікера заўсёды вялікая. Таму Наталля Качанава правядзе такую сустрэчу ў панядзелак, 10 студзеня, з 11.00 да 14.00.

Пасля яе работу з заяўнікамі працягне намеснік Старшыні Савета Рэспублікі Леанід Заяц, які будзе прымаць грамадзян з 14.00 да 17.00.

Калі ўзніклі дадатковыя пытанні па рабоце грамадскай прыёмнай, атрымаць адказы на іх можна па тэлефонах: 8 (017) 321 22 98, 327 46 74, 327 46 76.

Меркаванні

Валянціна РАЖАНЕЦ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па правах чалавека, нацыянальных адносінах і СМІ:

— Праект змяненняў і дапаўненняў Канстытуцыі Беларусі адкрывае важны перыяд у развіцці краіны. У папярэдняй рабоце над Асноўным Законам актыўны ўдзел узялі жыхары. Змяненні, што ўносяцца, — вынік вывучэння шматлікіх прапаноў, у тым ліку тых, якія гучалі падчас правядзення круглых сталоў, дыялогавых пляцовак.

Навацыі стануць падмуркам далейшага эвалюцыйнага развіцця нашай дзяржавы. Захаванне і ўдасканаленне сацыяльных гарантый, традыцыйных каштоўнасцяў, гістарычнай праўды — волевыяўленне беларусаў, якіх хвалюе лёс Радзімы.

Артыкул 15 Канстытуцыі прапанавана дапоўніць наступным важным зместам — «Дзяржава забяспечвае захаванне гістарычнай праўды і памяці аб гераічным подзвігу беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны».

Пры гэтым праектам уводзіцца і прынцып сацыяльнай адказнасці кожнага з нас за развіццё краіны.

Праектам Канстытуцыі замацоўваецца статус Усебеларускага народнага сходу як вышэйшага прадстаўнічага органа народаўладдзя, які вызначае стратэгічныя кірункі развіцця грамадства і дзяржавы. УНС забяспечвае, згодна з Асноўным Законам, непахіснасць канстытуцыйнага строю, пераемнасць пакаленняў і грамадскую згоду. Вызначаны праектам баланс улады і сістэма стрымлівання і процівагаў. Адпавядае імкненню народа і тое, што наша краіна выключае ваенную агрэсію са свайго боку.

Захаванне прэзідэнцкай рэспублікі — немалаважны акцэнт Канстытуцыі. Наша маладая дзяржава адбылася як прэзідэнцкая рэспубліка. На тых пляцоўках, дзе гучалі прапановы па Канстытуцыі, быў запыт на захаванне моцнай дзяржаўнай улады. Таму форма прэзідэнцкай рэспублікі для Беларусі з улікам пераразмеркавання паўнамоцтваў паміж галінамі ўлады адпавядае часу і патрэбам грамадства. Прэзідэнцкая форма кіравання, Усебеларускі народны сход накіраваны на захаванне згоды, далейшае развіццё моцнай дзяржавы.

Міхаіл СТРАЛЕЦ, доктар гістарычных навук, прафесар:

— З вялікай цікавасцю азнаёміўся з праектам змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь. Наконт раздзела «Асоба, грамадства, дзяржава» магу сказаць, што мы маем справу з больш дакладнымі фармулёўкамі ў параўнанні з тэкстам дзеючай Канстытуцыі. Несумненна, больш выразна стала адчувацца дыялектыка правоў і абавязкаў, бо, як вядома, не існуе правоў без абавязкаў, а абавязкаў без правоў.

Сведчаннем таму — артыкул 21, які датычыцца забеспячэння асноўных правоў і свабод грамадзян, прапанаванае ў яго дапаўненне: «Кожны павінен праяўляць сацыяльную адказнасць, уносіць пасільны ўклад у развіццё грамадства і дзяржавы».

Вельмі дарэчы аказалася дапаўненне ў артыкул 28 пра ўмовы для аховы персанальных даных і бяспекі асобы і грамадства пры іх выкарыстанні. Гэта тэма цяпер надзвычай актуальная. Фактычна кожны дзень мы чытаем паведамленні аб розных, часам самых вытанчаных, формах махлярства. І ўсе гэтыя лжэбанкіры, выдуманыя праваахоўнікі, аматары электроннай перапіскі пачынаюць расстаўляць свае злачынныя сеткі, абапіраючыся на персанальныя даныя патэнцыяльнай ахвяры. У выніку людзі нясуць матэрыяльныя і маральныя выдаткі, нярэдка вялікія.

Падтрымліваю і лічу своечасовым дапаўненне ў артыкул 32 пра абавязак бацькоў рыхтаваць дзяцей да грамадска карыснай працы, прывіваць ім культуру і павагу да законаў, гістарычных і нацыянальных традыцый Беларусі.

ДАСЛОЎНА

«Будзе створана дыялогавая пляцоўка, дзе людзі змогуць уносіць свае прапановы»

Заявіў **старшыня Магілёўскага аблвыканкама Анатоль ІСАЧАНКА** падчас абласнога семінара з ідэалагічным актывам Магілёўшчыны па актуальных пытаннях падрыхтоўкі і правядзення рэферэндума.

— Спачатку неабходна будзе правесці маштабную работу па данясенні да грамадзян значэння тых навацый, якія прапануюцца ў Канстытуцыю, — адзначыў ён. — Асноўны Закон Рэспублікі Беларусь і змяненні, якія ў яго ўносяцца, канешне, маюць стратэгічнае рашэнне для нашай краіны ў цэлым і рэгіёна ў прыватнасці. Нам трэба выходзіць да людзей і расказваць пра гэтыя навацыі, якія мэты яны маюць і для чаго патрэбны. Мы ўжо чвэрць стагоддзя жывём у суверэннай незалежнай краіне, за гэты час шмат што змянілася не толькі ў нас, але і ў свеце. Беларусь стала актыўна развіваць ІТ-галіну, атамную энергетыку. У краіне вырасла новае пакаленне беларусаў. З улікам усіх гэтых фактараў і трэба ўносіць змены. Каб і надалей наша краіна паступальна развівалася і рухалася.

Мы ўжо распачалі ў рэгіёне шырокую інфармацыйна-тлумачальную работу па падрыхтоўцы і правядзенні рэферэндуму і ўцягванні людзей для актыўнага ўдзелу ў ім. Створана 39 мабільных груп экспертаў для абмеркавання праекта Канстытуцыі ў працоўных калектывах, адбываюцца сустрэчы з удзелам прадстаўнікоў мясцовай улады, грамадскіх арганізацый, дэпутатаў. Арганізавана штодзённая работа гарачых ліній на базе грамадскіх прыёмных грамадскага аб'яднання «Белая Русь», праведзена пасяджэнне Каардынацыйнага савета грамадскіх аб'яднанняў і палітычных партый са зваротам да жыхароў Магілёўшчыны, праводзіцца сацыялагічнае экспрэс-апытанне па тэме будучага рэферэндуму. Хутка створым дыялогавую пляцоўку, дзе людзі змогуць уносіць свае прапановы. Мы іх будзем фіксаваць, акумуляваць і даводзіць да Вышэйшай атэстацыйнай камісіі, якая распрацоўвае прапановы змяненняў у Канстытуцыю.

Калі ў вас з'явяцца меркаванні з нагоды праекта — пішыце ў рэдакцыю або непасрэдна ў арганізацыю, якая будзе акумуляваць і аналізаваць усе заўвагі і прапановы, — Нацыянальны цэнтр прававой інфармацыі. Можна скарыстацца электроннай поштай sbor@ncpi.gov.by; можна запоўніць электронную форму, якая маецца на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале па адрасе: https://sbor.pravo.by; можна даслаць па пошце на адрас: 220030, г. Мінск, вул. Берсана, 1А, НЦПІ, з пазнакай «Канстытуцыя».

Мітрапаліт Веніямін:

«БЕЗ АПОРЫ НА ДУХОЎНЫ ЦЯЖКА ІСЦІ НАПЕРАД»

— У мінулы год шмат было размоў пра адзінства ў грамадстве. У чым асаблівасць царкоўнага вопыту яднання людзей?

— Калі мы кажам пра адзінства ў Царкве, то маем на ўвазе еднасць, якая дасягаецца вакол Хрыста — яе Заснавальніка. Гэта сапраўднае адзінства ва ўсёй паўнаце. Любое іншае саступае, бо, калі згадаць старую добрую прыказку, гэтае — не з-за страху, а па сумленні. Калі чалавек нешта робіць з-за страху пакарання, ён гэта робіць не так якасна, як калі б рабіў па ўнутраным перакананні. Тады не патрэбны кантроль. Мы сёння часта пра гэта забываем.

Царква заўсёды імкнулася аб'ядноўвацца вакол Хрыста, пры гэтым дапускала розныя меркаванні і падыходы. Адзінства павінна быць у галоўным, адрознасць у дэталях можа быць, бо існуюць розныя шляхі да выратавання, да духоўнай дасканаласці. Духоўныя кіраўнікі па-рознаму могуць весці да мэты, але вынік павінен быць адзін.

Апостал Павел у першым стагоддзі нашай эры казаў: «Бо павінна быць і разнамыснасць паміж вамі, каб выявіліся паміж вамі дасведчаныя» (1 Кар. 11, 19). Розныя ідэі і прапановы ў царкоўнай абшчыне разглядаюцца і між імі выбіраюцца лепшыя. Так ажыццяўляецца саборнасць у Царкве. Прынятае адміністрацыйным шляхам рашэнне можа быць добрым, але без асэнсавання гэтага падчас абмеркавання застанецца непаразуменне.

Адзінства ў свецкім грамадстве як правіла дасягаецца за кошт агульных нацыянальных ідэй, гісторыі і мэт. Але без духоўнага складніка ўзмацняюцца прыватныя, меркантыльныя інтарэсы.

Духоўнае асэнсаванне мае вялікую сілу, але і ў Царкве маюцца рознагалоссі і падзелы — сумныя вехі яе гісторыі. Так адбываецца, калі людзі асабістыя думкі і памкненні не падпарадкоўваюць агульнай добрай справе, калі сваё «я» не падпарадкоўваюць справе Хрыстовай. Часта прычына падзелу — недасканаласць чалавечай прыроды, унутранага чалавека, ганарлівасць, адстойванне свайго меркавання, нежаданне паказацца горшым за іншых, саступіць, пайсці насустрач, успрыманне гэтага як слабасці.

— Разам з тым Царква мае і станоўчы вопыт уз'яднання, адным з прыкладаў з'яўляецца асвячэнне Вамі закладкі храма стараверaў у Мінску.

— Абшчына стараверaў у гонар прарока Ілііі ўжо шмат гадоў знаходзіцца пад амафорам Беларускай праваслаўнай царквы. Сёлета ў яе з'явілася магчымасць пачаць будаўніцтва ўласнага храма. Гэта сапраўды вельмі добры крок да аб'яднання. Мы бачым, што розныя традыцыі ў богаслужэнні не перашкаджаюць праваслаўным быць разам. Гасподзь кажа пра тое, што Яму патрэбна сэрца чалавека, знешні бок — другаснае, хоць і гэта, несумненна, важнае для нас. Мяркую, у наш час у гэтым кірунку трэба выкарыстоўваць магчымасці, якія адкрываюцца, каб і іншыя стараверскія абшчыны ўбачылі, што можна і лепш быць нам разам. Можна супольна славіць Бога і захоўваць уласны абрад, гэта толькі ўзбагачае Царкву.

Разам з тым, на жаль, у наш час раз'яднанні ў праваслаўным свеце ўзмацняюцца. Гэты працэс патрабуе лячэння звыш. На ўзроўні чалавечых намаганняў пакуль не відаць, як сітуацыя можа быць вырашана. Але, несумненна, трэба да гэтага імкнуцца, бо Царква — Цела Хрыстовае, і падзел у ёй рыносіць пакуту яе Галаве — Хрысту.

Фота Яўгена ПРАСЕЦКАГА.

— 2022 гады таму нарадзіўся Хрыстос, каб выратаваць чалавецтва. На ваш погляд, які час перажывае чалавецтва ў нашы дні?

— Сучасныя людзі, жадаючы рэалізаваць сваю свабоду, сталі шукаць шлях, у тым ліку без абмежавання маральнымі прынцыпамі і абавязкамі. Яны бачаць у гэтым сапраўдную рэалізацыю свабоды. Але насамрэч у гэтым заключана вялікая небяспека, бо гэта нагадвае чалавека, які едзе па даросе і вырашае, што трымацца правілаў дарожнага руху не варта, шоб яны навязаныя, што ён сам можа вызначыць, з якой хуткасцю рухацца і дзе можна ісці на абгон. Гэтак жа чалавецтва кажа свайму Творцу, што дадзеныя Ім законы абмежоўваюць чалавечую прыроду, што яны састарэлі і сталі непатрэбнымі, што маральныя законы, прадпісанні, Евангельскае вучэнне наша жыццё абцяжарваюць. Гэта тэма актыўна развіваецца ў Еўропе, Амерыцы, у многіх краінах, дзе традыцыйна прысутнічае хрысціянства.

У выніку хрысціянства штучным чынам змяняе сваю форму, надае смак, так і хрысціяне павінны несці прыгажосць маральнага жыцця ў грамадства. Калі яе страціць, свет страціць самае галоўнае.

— Клопатам аб захаванні маральных норм прадыктаваны прапановы Беларускай праваслаўнай царквы ў праект абноўленай Канстытуцыі нашай краіны?

— Маральныя нормы — найважнейшы складнік закона любой дзяржавы. Без апоры на ўнутраны свет чалавека, на маральныя прынцыпы, духоўны падмурак народа цяжка ісці наперад і атрымліваць станоўчы вынік. Сёння вельмі важна мець добрую, выверaную Канстытуцыю з духоўным асэнсаваннем, якое мы вельмі настойліва прапануем уключыць у яе тэкст, каб звярнуць на гэта ўвагу ўсіх нашых сучаснікаў. Як чалавек без духоўнага жыцця, так і грамадства, не натхнёнае вышэйшымі ідэаламі, можа знешне выглядаць шчаслівым, але падсвядома заставацца незадаволеным, пры гэтым не ўсведамляць, чаго яму не хапае. Духоўную пустэчу імкнуцца запоўніць нечым вонкавым, але ў выніку чалавек пакутуе, страчвае пакой, яго раздзіраюць глыбокія ўнутраныя праблемы.

Нам вельмі важна, каб духоўна-маральныя аспекты былі ўзмоцнены ў Канстытуцыі, але не менш важна, каб яны ажыццяўляліся ў жыцці. Каб імі кіраваліся людзі, бо ўся складанасць не ў тым, каб добра скласці Канстытуцыю, а ў тым, каб жыць у адпаведнасці з прапісанымі прынцыпамі, якія закладзены ў ёй, і каб гэта прыносіла плён. Ёсць шмат еўрапейскіх краін, у якіх Канстытуцыя дастаткова добра выверана і складзена, але гэта не спыняе рух у бок адмовы ад хрысціянскай маралі. У гэтым праблема сучаснага свету, і яе трэба вырашаць. Пра гэта што не на карысць Царкве (кажу пра ўсіх хрысціян) і не на карысць свету. Гэта адбіваецца на маральным жыцці ўсяго грамадства. Хрыстос, калі звяртаецца да хрысціян, кажа: «Вы — соль зямлі» (Мф. 5, 13). Гэта значыць, хрысціяне сваім ладам жыцця, паводзінамі павінны паказваць адпаведны прыклад, тым самым не дапускаць заняпад чалавецтва. Як соль не дапускае гніення прадуктаў, захоўвае іх якасць, нам трэба перш за ўсё клапаціцца і ў нашай краіне.

— Наколькі актыўнымі павінны быць хрысціяне?

— Кожны хрысціянін закліканы да таго, каб спачатку ў сябе знутры, у душы, усё правільна выбудаваць. «Бо ад перапоўненасці сэрца гавораць вусны» (Мф. 12, 34). Калі ўнутры ўсё адпавядае духоўным законам, тады добрае распаўсюджваецца. Няправільна займацца вялікай знешняй дзейнасцю, калі знутры няма ўстойлівага міру і непахісных маральных прынцыпаў.

Нашы свяшчэннаслужыцелі досыць актыўныя, па сваіх пастырскіх абавязках яны працуюць на розных кірунках: сацыяльнае служэнне, работа з моладдзю, асветніцкая дзейнасць, узаемадзеянне з узброенымі сіламі, турэмнае служэнне... Гэта дадатковая нагрузка, акрамя здзяйснення богаслужэнняў. Пры гэтым у іх няма нармаванага працоўнага часу. У святочныя і выхадныя дні іх нагрузка ўзрастае, бо ў іх дапамозе, парадах маюць патрэбу людзі.

Калі падсумаваць, хрысціянам важна прымаць удзел ва ўсіх сферах жыцця, але з аглядкай на свой унутраны свет і з разуменнем вынікаў працы як для сябе, так і для грамадства. Такі самааналіз дапамагае своечасова спыніцца, зрабіць карэкціроўку, магчыма, ад нечага адмовіцца. «Бо якая карысць чалавеку, калі ён увесь свет здабудзе, а душы сваёй пашкодзіць?» (Мф. 16, 26). Гэта словы Спасіцеля.

— На постсавецкай прасторы асаблівае стаўленне да актыўнасці Царквы, не кажучы пра асаблівасці сённяшняга секулярызаванага часу. Ці гатова Беларуская праваслаўная царква да крытыкі, якую выклікае яе пазіцыя, да абвінавачвання ў палітызацыі? Ці павінна яна ў гэтым выпадку апраўдвацца?

— Людзі высокага святога жыцця, якіх шануюць і тыя, хто не лічыць сябе вернікам, — прападобная Еўфрасіння Полацкая, свяціцель Кірыл Тураўскі — у шэрагу іншых святых казалі пра тое, што апраўдвацца не трэба. Апостал Павел, калі разважаў на гэту тэму ў Першым пасланні да Карынфянаў, казаў: «Для мяне вельмі мала значыць, як мяркуеце пра мяне вы або іншыя людзі». Ён дадаў: «Я і сам пра сябе не мяркую». Гэта не значыць, што ён грэбуе меркаваннем іншых людзей, але не падладжваецца пад яго. Ён тлумачыць, чаму так робіць: «...суддзя ж мне Гасподзь». Апостал свае дзеянні суадносіць з вышэйшым законам, бо ўзровень законаў чалавечых і меркаванні людзей ніжэйшыя. Пры гэтым апостал Павел, грамадзянін Нябеснага Царства, трымаўся і нормаў зямной дзяржавы, у якой жыў.

Царква выконвае ўказанні Хрыста, Сына Божага, Спасіцеля свету — Таго, Хто не толькі кіруе гэтым светам, але і клапоціцца пра яго, з'яўляецца Айцом, які любіць сваіх дзяцей. Хрыстос навучыў нас звяртацца да Бога як да Айца. Ён пакінуў нам прамое ўказанне: «...дык ідзіце, навучыце ўсе народы» (Мф. 28, 19). Духоўныя законы, якія мы маем у Царкве, — не наша выдумка. Гэта тое, чаму навучыў, калі прыйшоў на зямлю, Сын Божы. Ён жадаў, каб гэтым кіраваліся людзі. Сёння Царква імкнецца добрае, важнае, значнае, выратавальнае для ўсяго чалавецтва даносіць да грамадства, казаць пра гэта. Царква не замыкаецца ў сабе. Апостал кажа: «... і гора мне, калі не дабравешчу!» (1 Кар. 9, 16).

Людзі, якія свядома пазбягаюць маральных тэм, якім духоўныя прынцыпы перашкаджаюць жыць свабодна і, як ім падаецца, лепш, стараюцца супрацьставіць сваё меркаванне царкоўнаму, шукаюць недахопы, недакладнасці ў дзеяннях Царквы і яе служыцеляў. На жаль, гэта непазбежна. Якім ідэалам з'яўляўся Хрыстос — вылечваў людзей, меў слова суцяшальнае, дакладнае, выверанае, правільнае. Але і Яго слова не ўсе ўспрымалі. Некаторыя шукалі, як Яго забіць, і, зрэшты, забілі.

Гэта змаганне дабра і зла працягваецца. Пра тое ж казаў і вядомы пісьменнік Фёдар Міхайлавіч Дастаеўскі, 200-годзе якога мы святкавалі, карані якога з сяла Дастоева Іванаўскага раёна Брэсцкай вобласці. Ён казаў: «Тут д'ябал з Богам змагаецца, а поле бітвы — сэрцы людзей».

ПАДМУРАК НАРОДА

Гутарка з Патрыяршым Экзархам усяе Беларусі Мітрапалітам Мінскім і Заслаўскім Веніямінам напярэдадні Каляд

Паколькі Царква жадае, каб грамадства развівалася гарманічна, яе доўг — заўсёды нагадваць пра маральныя, духоўныя прынцыпы. Там, дзе гатовы нас пачуць, дзе гатовы прыняць Слова, мы стараемся казаць.

— Наш час можна назваць яшчэ і эпохай страху. Гэта датычыцца глабальных пагроз, у тым ліку пандэміі. Але ж Хрыстос вучыў нічога не баяцца. Адначасова хрысціянства нагадвае пра страх Божы. Як спалучыць сучаснаму чалавеку ў сабе бясстрашнасць і страх? Чаго нам варта сапраўды баяцца, а чаго — не?

— Два страхі... Іх, вядома, больш, але асноўныя два — страх Божы і страх чалавечы. Апошні — калі мы баімся нейкіх абставін жыцця, хвароб, смерці, дзікіх жывёл, непрыемнасцяў на рабоце і шмат чаго яшчэ. Страх Божы — калі чалавек баіцца няправільным сваім учынкам, словам, нават думкай, засмуціць Бога — Айца, які яго любіць. Настаўнікі Царквы вучаць нас, што ўсё стане на сваё месца, калі на першым месцы будзе страх Божы. Яшчэ ў Старым Запавеце сказана: «Пачатак прамудрасці — баяцца Бога» (Сір. 1, 15). Гэта — пачатак найвышэйшай ступені мудрага стаўлення да жыцця. Ад страху Божага знаходзяцца правільныя рашэнні, здзяйсняюцца правільныя ўчынкі.

Калі чалавек асэнсоўвае, што яму трэба правільна паступаць перад Богам, з захаваннем маральных законаў, запаветаў Божых, тады ён паступова прыходзіць у стан, дзе ўжо няма страху чалавечага. Бо асэнсоўвае, што Бог клапоціцца пра яго і, калі трэба, папярэдзіць гора, хваробу, непрыемнасць. А калі дапусціць, значыць, з нейкай добрай мэтай, і гэта трэба правільна пераадолець, знайсці ў тым, што адбылося, карысць.

Апостал Іаан кажа: «У любові няма страху, а дасканалая любоў праганяе страх» (1 Ін. 4, 18). Ён кажа пра любоў да Бога. Як маці клапоціцца пра сваё дзіця, любіць яго і не баіцца падняцца ноччу, не выспацца, не даесці, стаміцца, як яна ўсе сілы аддае дзіцяці, так і чалавек, які глыбока палюбіў Бога, любіць і бліжняга свайго, і ўжо нічога не баіцца. Апостал Павел запытвае: «Хто адлучыць нас ад любові Хрыстовай: гора, ці ўціск, ці голад, ці галеча, ці небяспека, ці меч?» І далей упэўнена адказвае: «Але ўсё гэта мы поўнасцю перамагаем сілаю Таго, Хто ўзлюбіў нас» (Рым. 9, 35—37). Калі чалавек любіць Бога, Які любіць чалавека, усё астатняе — другаснае.

Такога стану дасягаюць святыя людзі, яны перастаюць трывожыцца, не баяцца небяспекі, хоць і застаюцца звычайнымі людзьмі. Нават людзі святога жыцця часам перажывалі чалавечы страх, але праз малітву, развагу пра Слова Божае пераадольвалі яго і паказвалі мужнасць і цвёрдасць, якія здзіўлялі іншых.

— Мы размаўляем напярэдадні вялікага свята, але заўсёды ёсць людзі, якія сустракаюць свята ў скрусе. Ці заўсёды гора — наступства нашых учынкаў? Як убачыць карысць і дабро ў незваротнай страце?

— Часам у жыцці здараецца, што чалавек мяняе месца вучобы, працы, месца жыхарства. Бывае, што чалавек сам прымае такое рашэнне, але здараецца, што да гэта падштурхоўваюць абставіны. У духоўным жыцці адбываюцца падзеі, якія мы не заўсёды можам растлумачыць. Мы можам захварэць у выніку парушэння намі духоўнамаральнага закона. Але хварэюць і праведнікі. Тут важна разумець, што жыццё пасля смерці працягваецца. Што смерць — гэта пераход у новую сферу жыцця. Часам горкія абставіны падводзяць нас да разумення гэтага.

Смерць блізкіх разбурае наш унутраны свет, пазбаўляе спакою, прычыняе боль, але, як бацькі не ўсё тлумачаць сваім дзецям, калі кіруюцца добрым памкненнем у клопаце пра дзіця, так і мы не заўсёды разумеем, у чым сэнс таго або іншага Божага дзеяння ў адносінах да нас або дапушчэння няшчасця, якое з намі здарылася, нават насуперак Яго волі.

— Наступны год Беларуская праваслаўная царква адзначае сваё 1030-годдзе. Ці можаце вы сказаць, на якім этапе свайго развіцця яна знаходзіцца цяпер?

— Хачу зноў паўтарыць словы апостала Паўла: «Я і сам пра сябе не мяркую». Даваць ацэнку стану Царквы, нават вонкава, будзе памылкай. Бо Гасподзь ацэніць і кожнаму дасць па яго справах.

Цяжкасці, якія перажывае грамадства, адбіваюцца і на царкоўным жыцці. Разам з тым мы абапіраемся на евангельскія словы пра тое, што трэба пераадольваць складанасці, спадзявацца на дапамогу Бога, маліцца, быць пільнымі, радавацца, за ўсё дзякаваць. Гэта дапамагае нам.

Царква нясе Слова Хрыста людзям, але тое, што мы скажам пра яе жыццё сёння, праз паўгода можа аказацца зусім іншым. Таму лепш не даваць ацэнку яе развіццю. Людзі, якія глядзяць на служэнне Царквы, няхай кіруюцца добрымі думкамі, бо Царква — гэта і ёсць людзі, якія сабраліся разам, каб адказаць на любоў Бога.

Мы абапіраемся на духоўную спадчыну, якая перадавалася нам з пакалення ў пакаленне вось ужо 1030 гадоў. Столькі прайшло часу з моманту, калі праваслаўе кананічна было аформлена на нашых землях праз стварэнне Полацкай епархіі. Гэтая духоўная спадчына — надзейны падмурак для ўсяго грамадства, краіны, усяго беларускага народа. Царква нагадвае пра гэты духоўны падмурак і дапамагае сучаснікам у іх жыцці і працы.

— Дзякуй, Уладыка, за размову.

— Дазвольце завяршыць яе віншаваннем з Раждаством Хрыстовым! Хрыстос прыйшоў на зямлю для выратавання роду чалавечага, бо чалавецтва знаходзілася ў вельмі цяжкім стане і само ўжо не магло справіцца з тым, каб змяніць цячэнне гісторыі, узаемаадносіны краін і народаў. Патрэбна была дапамога звыш. Разам з тым Хрыстос — Уладыка Сусвету, Цар цароў — нараджаецца ў пячоры, Яго кладуць у яслі для жывёлы, спавіваюць як звычайнае дзіця. Ён адчувае холад і нязручнасці такога прыходу ў чалавечы свет. Хрыстос, які паказаў прыклад, выказаў да нас клопат і любоў. У адказ мы павінны выказваць узаемныя пачуцці і дзякаваць Богу, старацца быць на Яго падобнымі.

Гэтымі днямі важна ўнутрана прымірыцца з усімі, усім дараваць, пайсці насустрач адно аднаму. Няхай добразычлівасць дзеля народжанага Боганемаўляці прысутнічае ў нашых сэрцах, нашых малітвах за іншых, жаданні дапамагчы адно аднаму. Няхай усё гэта прыводзіць да канкрэтных спраў, якія падобныя на справы Хрыста.

Там, дзе ёсць магчымасць, наведайце храм падчас святочнага начнога богаслужэння. Гэта служба прасякнутая асабліваым настроем, яна перадае дух сустрэчы Спасіцеля свету. Сама святочная ноч нараджае асабліваія пачуцці суперажывання Раждаству Хрыстоваму. Калі няма магчымасці ўзяць удзел у начным богаслужэнні, зрабіце гэта раніцай. Калі няма і гэтай магчымасці, то паглядзіце трансляцыю па тэлебачанні. Пачытайце свяшчэнныя тэксты пра гэту падзею, літаратуру святых айцоў, паразважайце на гэту тэму. Падчас свята Раждаства вельмі важнае нараджэнне пэўных пачуццяў у душы, сярод якіх самае галоўнае — падзяка Богу, любоў да Яго. Гэта і павінна напоўніць нашы сэрцы.

Тым, хто зараз перажывае хваробу, хачу пажадаць пераадолець гэты стан з Божай дапамогай, з малітвай, з упэўненасцю ў тым, што, як сказана ў старой прыказцы, няма ліха без дабра. Як правіла, мы чакаем дабра знешняга, матэрыяльнага характару, але гэта прыказка мае на ўвазе ўнутранае перажыванне. Пасля хваробы чалавек вышэй цэніць здароўе, ён удзячны Богу. Калі мы вяртаем магчымасць чалавечых зносін пасля іх часовай страты, то таксама гэта больш цэнім. Душа ў цяжкіх абставінах утаймоўваецца і атрымлівае суцяшэнне. Ведаю шмат людзей, якія змаглі правільна перанесці складанасці сённяшняга часу і ў духоўным плане набылі больш, чым у звыклым, размераным цячэнні свайго жыцця. Выпрабаванні прыносяць новы духоўны досвед, падштурхоўваюць да пераасэнсавання жыцця. Гэта вельмі важна.

Жадаю, каб радасць аб Госпадзе напоўніла нашы сэрцы. Песнапенні, якія гучаць напярэдадні вялікага свята, заклікаюць: «Хрыстос нараджаецца — слаўце! Хрыстос з нябёс — сустракайце!» Будзьма ў лікаванні сустракаць свята, дзякаваць Богу, дзяліцца радасцю з бліжнімі. Жадаю ўсім добрага здароўя, шчаслівых узаемаадносін у сям'і, на рабоце, няхай усюды пануюць паразуменне, згода і любоў!

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

ПАСЛАННЕ ДА РАЖДЖАСТВА ХРЫСТОВАГА

Узлюбленыя архіпастыры, пастыры, манахі
і ўсе верныя дзеці
Беларускай Праваслаўнай Царквы!

Сёння нашы сэрцы напоўнены светлай і ўрачыстай радасцю за нараджэнне ў свет Спасіцеля, сёння кожны з нас чуе ангельскі спеў: «Слава ў вышынях Богу і на зямлі мір, у людзях добрая воля» (Лк. 2, 14). Зноў і зноў свята Раждаства Госпада нашага Іісуса Хрыста ўсяляе ў нашы сэрцы радасць, надзею і спадзяванне, бо «...дзіця нарадзілася нам — Сын, дадзены нам» (Іс. 9, 6).

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

У чым жа крыніца гэтай сардэчнай радасці і духоўнай весялосці? Свяціцель Дзімітрый Растоўскі, раскрываючы значэнне слоў апостальскага паслання пра тое, што Хрыстос «прынізіў Сябе Самога, прыняўшы вобраз раба, зрабіўшыся падобным да людзей і па выглядзе стаўшы як чалавек» (Флп. 2, 7), кажа: «Ён так узлюбіў нас, што раздаў нам усю маёмасць Свайго нябеснага багацця і, як бы не маючы больш нічога, каб даць, у рэшце рэшт даў нам Самога Сябе». Раждаство Хрыстова гаворыць пра вялікую любоў Бога да чалавека, любоў, якую не можа цалкам умясціць і зразумець ні чалавечы, ні нават ангельскі розум. Але гэтая любоў, дзякуючы якой мы «жывём і рухаемся і існуём» (Дзеян. 17, 28).

Пра мір на зямлі спяваюць ангелы ў дзень Раждаства Спасіцеля. «Мір вам!», — абвяшчае Гасподзь Сваім вучням. І апостал Павел сведчыць пра Хрыста: «Бо Ён — мір наш, які зрабіў з абодвух адно і зруйнаваў сцяну, якая падзяляла іх» (Эф. 2, 14). Менавіта міру не хапала чалавецтву ва ўсе часы. Міру і згоды мы жадаем нашаму народу. І сённяшняя ўрачыстасць паказвае нам на той цвёрды падмурак, на якім мы можам будаваць мірныя ўзаемаадносіны і ў нашых сем'ях, і ў грамадстве, і паміж народамі. Вера ва ўцялесненага Бога, Які ўзлюбіў нас, любоў у адказ чалавека да свайго Тварца, выкананне Яго запаведзяў, клопат і апека бліжніх — вось шлях, пра які Гасподзь гаварыў яшчэ прароку Маісею: «Выберы жыццё, каб жыў ты і патомства тваё» (Друг. 30, 19).

Сёння гэтыя словы асабліва актуальныя. Зноў перад усім чалавецтвам і нашым народам стаіць выбар. Гасподзь прапануе нам Сваю ўсёмагутную дапамогу і адкрывае шлях, на якім мы знойдзем мір, згоду, сардэчную радасць і зможам з надзеяй глядзець у будучыню. Але гэтаму выбару супрацьстаяць сучасныя спакусы, якія адкрыта прапануюць адмову ад маральных нормаў і абмежаванняў, прапануюць забыццё духоўнай спадчыны, спробу пабудаваць грамадства без Божых паняццяў святасці і праўды.

У падзеях, якія суправаджалі нараджэнне Спасіцеля, не было нічога выпадковага. Ён прыходзіць у свет так, як прыходзіць кожны чалавек — праз нараджэнне ад маці. Евангелле апавядае нам пра тое, што Гасподзь выхоўваецца ў сям'і, знаходзіцца ў паслушэнстве Свайму нарачонаму бацьку, у Яго ёсць зямныя сваякі і зямны радавод. Свой першы цуд Хрыстос здзейсніць на шлюбным сяце ў Кане Галілейскай.

Тым самым Гасподзь благаслаўляе і асвячае саюз мужчыны і жанчыны, устаноўлены Богам яшчэ на пачатку чалавечай гісторыі. Невыпадкова сёння менавіта сям'я і благаслаўёныя Богам адносіны паміж мужам і жонкай, бацькамі і дзецьмі асабліва цэрпяць ад разбуральнага веяння «духа веку гэтага». Таму на нас, хрысціянах, ляжыць вялікая адказнасць у справе захавання гэтага Божага ўстанаўлення.

Сям'я з'яўляецца не проста інстытутам або ячэйкай грамадства, а найвялікшым дарам Бога чалавецтву. Менавіта сямейныя адносіны ствараюць спрыяльнае асяроддзе, у якім чалавек здольны навучыцца любові і ўзаемнай адказнасці, дасягнуць высокіх узораў маральнага жыцця. Сям'ю называюць малой царквой — часткай і вобразам Царквы Усяленскай. У ёй людзі знаходзяцца разам, моляцца, клапоцяцца адзін пра аднаго, стараюцца зразумець адзін аднаго, ва ўзаемнай пакоры пераадольваюць свае недасканаласці. І благаслаўёная Богам сям'я, у якой ёсць любоў, давер і згода, сапраўды можа стаць вобразам раю на зямлі.

Жадаю вам усім, дарагія ў Госпадзе браты і сёстры, усямернай і заўсёднай радасці за народжанае Богадзіця. Няхай мір, пра які сёння абвяшчаюць ангелы, застаецца ў сэрцы кожнага чалавека, у нашых сем'ях, працоўных калектывах, ва ўсёй нашай Айчыне і за яе межамі. Доброга вам здароўя, духоўнай мудрасці і ўсёмагутнай дапамогі Божай на ўсіх жыццёвых шляхах. Няхай Гасподзь пашле ўсім нам, і асабліва нашым сем'ям, дабрадзейнае і мірнае жыццё з усёй набожнасцю і чысцінёй!

ВЕНІЯМІН,
Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі,
Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі.

Сведения о результатах проведения Рекламной игры

«ПРАЗДНУЙТЕ ВМЕСТЕ!»

Сведения об организаторе:
Белорусско-эстонское совместное предприятие «ПРАЙМЭРИ» общество с ограниченной ответственностью с местом нахождения по адресу: 220030, Республика Беларусь, г. Минск, пер. Казарменный, дом 4, помещение 2. УНП 101132766.

Наименование Рекламной игры:
«Празднуйте вместе!»

Срок начала и окончания Рекламной игры:
Срок начала Рекламной игры – 15 ноября 2021 года.
Срок окончания Рекламной игры – 14 января 2022 года.

Сведения о государственной регистрации Рекламной игры:
Рекламная игра зарегистрирована Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь 5 ноября 2021 года, свидетельство о государственной регистрации Рекламной игры № 4099.

Сведения о количестве участников Рекламной игры:
В Рекламной игре приняло участие 923 человека.

Сведения о розыгрыше призового фонда:
Призовой фонд Рекламной игры разыгран полностью.

Сведения о победителях и их выигрышах:
Фамилии и инициалы победителей с указанием их выигрышей размещены на сайте **www.whiskas-promo.by по адресу https://whiskas-promo.by/docs/new_winners.pdf** в глобальной компьютерной сети Интернет.

Телефон для справок по вопросам проведения Рекламной игры: +375 17 239 07 17.

БЕЛАРУСБАНК

ОАО «АСБ Беларусбанк» объявляет о проведении открытого аукциона по продаже объекта недвижимого имущества методом повышения начальной цены (шаг – 5 %):

№ лота	Характеристика имущества	Местонахождение имущества	Начальная цена
1	Изолированное помещение (назначение: помещение специализированное финансового назначения; наименование: помещение банка) с инвентарным номером 253/D-6180, общей площадью: 38,3 кв. м	Витебская обл., г. п. Россоны, ул. Советская, 5-1	25 152,00 руб., в т. ч. НДС по ставке 20 % – 4 192,00 руб.

Организатор торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества – Витебское областное управление № 200 ОАО «АСБ Беларусбанк».

Заявление на участие принимаются по адресу: г. Витебск, ул. Ленина, 10б, кабинет 0.1 в срок до 16.00 08.02.2022.

Юридические лица, индивидуальные предприниматели, физические лица, подавшие заявления на участие в аукционе, перечисляют задаток в размере 10 % от начальной цены лота **в срок до 12.00 08.02.2022** на расчетный счет BY69 AKBB 6670 8597 0000 2000 0000 открытый в ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 100325912, назначение платежа – задаток для участия в аукционе.

Аукцион состоится 10.02.2022 в 11.00 по адресу: г. Витебск, ул. Ленина, 10б, первый этаж, актовый зал.

Особые условия: победителем аукциона либо единственным участником возмещаются затраты на организацию и проведение аукциона в размере расходов, связанных с публикацией извещения в СМИ. Победитель аукциона либо единственный участник дополнительно возмещает расходы по оценке имущества в размере 239,60 руб. с НДС.

Дополнительно победитель аукциона либо единственный участник приобретает объекты основных средств по стоимости 217,43 руб. (в т. ч. НДС по ставке 20 %): электросчетчик CE102 S7145 AOKSVZ с ЩК-11-01, кондиционер General Climat GC/GU-S, электросчетчик CE 1-Ф (5-60А).

Организатор аукциона вправе отказаться от его проведения не позднее чем за три рабочих дня до даты наступления даты его проведения. Срок подписания договора купли-продажи предмета аукциона победителем либо единственным участником не позднее 30 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов.

Необходимую информацию по вопросам участия в аукционе можно получить по телефонам: (0212) 20-48-55, 8 (029) 309-42-19.

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении 20 января 2022 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ИНТЕГРАЛ» – управляющая компания холдинга «ИНТЕГРАЛ»

Наименование, характеристики и местонахождение предмета торгов (продаваемого имущества)	Капитальное строение* с инв. номером 254/С-11593 общей площадью 1 268,5 кв. м, расположенное по адресу: Витебская обл., Миорский р-н, Узменский с/с, д. Леонполь, ул. Парковая, 1, наименование – усадебный дом, назначение – памятник исторический, идентифицированный в основном как нежилой дом, составные части и принадлежности: кирпичный подвал, четыре кирпичных столба, дощатое ограждение, деревянные ворота, три калитки; капитальное строение** с инв. номером 254/С-11594 общей площадью 241,9 кв. м, расположенное по адресу: Витебская обл., Миорский р-н, Узменский с/с, д. Леонполь, ул. Парковая, 1/1; наименование – спальный корпус, назначение – здание нежилое; капитальное строение** с инв. номером 254/С-11595 общей площадью 421,6 кв. м, расположенное по адресу: Витебская обл., Миорский р-н, Узменский с/с, д. Леонполь, ул. Парковая, 1/2; наименование – столовая с пристройкой, назначение – здание нежилое, составные части и принадлежности – кирпичная пристройка
Сведения о земельном участке	Право аренды на земельный участок площадью 1,3564 га (срок действия: с 25.10.2012 по 23.08.2062), кадастровый номер – 223381306 601000107, целевое назначение – земельный участок для обслуживания объектов историко-культурного назначения: объектов усадебно-паркового комплекса «Леонполь» (усадебного дома с остатками флигеля, воротами и оградой, спального корпуса, столовой с пристройкой), назначение в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества – земельный участок историко-культурного назначения
Продавец имущества	ОАО «ИНТЕГРАЛ» – управляющая компания холдинга «ИНТЕГРАЛ», 220108, г. Минск, ул. Казинца, 121А
Организатор торгов	Государственное предприятие «МГЦН», 220030, г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10
Начальная цена предмета торгов, с учетом НДС: 189 024,0 бел. руб.	**Сумма задатка:** 18 900,00 бел. руб.

Необходимые условия: победитель торгов (покупатель) после перехода права собственности на продаваемое имущество обязан в течение одного месяца подписать охранное обязательство и обеспечить сохранность историко-культурной ценности.

**Ограничения (обременения) прав на недвижимое имущество, установленные в связи с присвоением ему статуса памятника историко-культурного наследия.*
***Капитальное строение входит в перечень материальных объектов, которым придан статус и категория историко-культурных ценностей Республики Беларусь, утвержденный постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 14.05.2007 № 578 «Аб статусе гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь».*

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ИНТЕГРАЛ» – управляющая компания холдинга «ИНТЕГРАЛ», утвержденным организатором торгов.

Условия торгов: победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, назначение платежа – задаток для участия в аукционных торгах от 20.01.2022.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся **20 января 2022 года в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 7, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 06.01.2022 по 18.01.2022** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.30) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

По вопросу ознакомления с продаваемым имуществом следует обращаться по телефону (017) 398-63-61.

Телефоны для справок: (017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»); (017) 398-63-61 (ОАО «ИНТЕГРАЛ»-управляющая компания холдинга «ИНТЕГРАЛ»).

Дополнительная информация размещена на сайте **www.mgcn.by** в разделе «Недвижимость в собственность».

ЗАО «БелБанкротАукцион», организатор торгов по продаже имущества Бобруйское ОАО «Агромашсервис» (УНП 700003471), объявляет о проведении 21.01.2022 г. с 9.00 до 16.00 на электронной торговой площадке bankrottorg.by электронных торгов в форме аукциона

Предмет торгов:

№ п/п	Наименование	Начальная стоимость, бел. руб., без НДС	Сумма шага, бел. руб.	Размер задатка, бел. руб.	Минимальная стоимость, бел. руб., без НДС
1	Капитальное строение с инв. № 710-С/51529 (склад мин. удобрений); Бобруйск, ул. Гоголя, 182 Капитальное строение с инв. № 710-С/51531 (склад мин. удобрений); Бобруйск, ул. Гоголя, 182 Капитальное строение (склад ядохимикатов); Бобруйск, ул. Гоголя, 182 Капитальное строение (склад с бытовками); Бобруйск, ул. Гоголя, 182 Капитальное строение (здание весовой с КПП); Бобруйск, ул. Гоголя, 182 Капитальное строение (склад мин. удобрений с высокими); Бобруйск, ул. Гоголя, 182 Капитальное строение (здание неустановленного назначения); Бобруйск, ул. Гоголя, 182 Ж/д пути необщего пользования; Бобруйск, ул. Гоголя, 182	3 864 000,00	193 200,00	386 400,00	2 760 000,00

Размер задатка: 10 % от начальной стоимости имущества.

Шаг аукциона: 5 % от начальной стоимости имущества в размере.

Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочее время, предварительно связавшись с контактным лицом по тел. +375296083100.

Продавец: **Бобруйское ОАО «Агромашсервис»**.

Организатор торгов: ЗАО «БелБанкротАукцион», 220015, г. Минск, ул. Гурского, д. 22б, комн. 501; +375 29 608 31 00; contact@bankrottorg.by.

Для участия в торгах необходимо уплатить задаток в размере 10 % от начальной стоимости лота не позднее 20.01.2022 г. на р/с BY16 UNBS 3012 0116 4010 0000 8933, в ЗАО «БСБ Банк», БИК UNBSBY2X, УНП 193417684, получатель – ЗАО «БелБанкротАукцион». Назначение платежа: задаток за участие в торгах по лоту № (номер лота).

Заявления на участие в торгах принимаются с 9.00 06.01.22 по 17.00 20.01.22 на bankrottorg.by.

К заявке на участие в торгах прилагаются (для юридических лиц) и направляются в отсканированном виде по адресу: contact@bankrottorg.by следующие документы:

- свидетельство о государственной регистрации юр. лица (ИП);
- устав юридического лица;
- решение высшего органа управления юридического лица об участии в торгах, о заключении договора купли-продажи предмета электронных торгов, по итогам их проведения;
- для физических лиц: 31, 32, 33 стр. паспорта.

Организатор торгов может отказаться от проведения торгов не позднее чем за пять дней до даты проведения торгов.

Оформление участия в торгах в соответствии с регламентом ЭТП.

Победителем торгов признается лицо, предложившее наивысшую цену за предмет торгов.

Оформление результатов торгов в соответствии с регламентом ЭТП в день проведения торгов.

В случае признания торгов несостоявшимися предмет торгов может быть продан единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (претендент на покупку), при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Затраты на организацию и проведение публичных торгов в электронной форме составили: стоимость размещения объявления в газете «Звязда» согласно счет-фактуре; аукционный сбор по лоту 0,5 % от цены реализации предмета торгов; за размещение объявления о проведении торгов в базе данных ЕГРСБ 480,00 бел. руб.; 2800,00 бел. руб. за оценку.

Срок подписания договора купли-продажи: в течение пяти рабочих дней со дня проведения аукциона.

Срок и порядок оплаты (условия оплаты) предмета электронных торгов: в течение 5 (пяти) рабочих дней с даты проведения электронных торгов.

ЗАО «БелБанкротАукцион», организатор торгов по продаже имущества Бобруйское ОАО «Агромашсервис» (УНП 700003471), объявляет о проведении 07.02.2022 г. с 9.00 до 16.00 на электронной торговой площадке bankrottorg.by электронных торгов в форме аукциона

Предмет торгов:

№ п/п	Наименование	Начальная стоимость, бел. руб., без НДС	Сумма шага, бел. руб.	Размер задатка, бел. руб.	Минимальная стоимость, бел. руб., без НДС
1	Капитальное строение с инвентарным номером 710/С-61213 (Назначение – здание специализированное для производства машин и оборудования (машиностроения), наименование – здание МТП). Общая площадь – 1347,80 кв. м. Зем. участок с кадастровым № 741000000003000031 площадью 3,1250 га. Адрес: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Орджоникидзе, д 78. Доп. условие: ипотека банка Здание цеха нестандартного оборудования; Общая площадь – 1288,00 кв. м. Зем. участок с кадастровым № 741000000003000031 площадью 3,1250 га. Адрес: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Орджоникидзе, д. 78 Здание проходной, составные части и принадлежности – ворота, забор. Общая площадь – 8,6 кв. м. Зем. участок с кадастровым № 741000000003000031 площадью 3,1250 га. Адрес: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Орджоникидзе, д. 78 Капитальное строение с инвентарным номером 701/С-51657 (Назначение – здание нежилое, наименование – здание цеха для распиловки древесины). Общая площадь – 195,00 кв. м. Адрес: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Гоголя, д. 166	262 030,00	13 101,50	26 203,00	157 218,00
2	Капитальное строение и инв. № 710/С-55897 (назначение – здание нежилое). Наименование – Котельная. Общая площадь – 203,5 кв. м. Зем. участок с кадастровым № 741000000003000858 площадью 0,1189 га. Адрес: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Орджоникидзе, д. 78	14 200,00	710,00	1 420,00	8 520,00
3	Капитальное строение. Наименование – здание металлического гаража. Зем. участок с кадастровым № 741000000003000031 (присвоен предварительно). Адрес: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Гоголя, д. 78	20 600,00	1 030,00	2 060,00	12 360,00

Размер задатка: 10 % от начальной стоимости имущества.

Шаг аукциона: 5 % от начальной стоимости имущества в размере.

Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочее время, предварительно связавшись с контактным лицом по тел. +375 29 608 31 00.

Продавец: **Бобруйское ОАО «Агромашсервис»**.

Организатор торгов: ЗАО «БелБанкротАукцион», 220015, г. Минск, ул. Гурского д. 22б, комн. 501; +375 29 608 31 00; contact@bankrottorg.by.

Для участия в торгах необходимо уплатить задаток в размере 10 % от начальной стоимости лота не позднее 04.02.2022 г. на р/с BY16 UNBS 3012 0116 4010 0000 8933, в ЗАО «БСБ Банк», БИК UNBSBY2X, УНП 193417684, получатель – ЗАО «БелБанкротАукцион». Назначение платежа: задаток за участие в торгах по лоту № (номер лота).

Заявления на участие в торгах принимаются с 9.00 06.01.22 по 17.00 04.02.22 на bankrottorg.by.

К заявке на участие в торгах прилагаются (для юридических лиц) и направляются в отсканированном виде по адресу: contact@bankrottorg.by следующие документы:

- свидетельство о государственной регистрации юр. лица (ИП);
- устав юридического лица;
- решение высшего органа управления юридического лица об участии в торгах, о заключении договора купли-продажи предмета электронных торгов, по итогам их проведения;
- для физических лиц: 31, 32, 33 стр. паспорта.

Организатор торгов может отказаться от проведения торгов не позднее чем за пять дней до даты проведения торгов.

Оформление участия в торгах в соответствии с регламентом ЭТП.

Победителем торгов признается лицо, предложившее наивысшую цену за предмет торгов.

Оформление результатов торгов в соответствии с регламентом ЭТП в день проведения торгов.

В случае признания торгов несостоявшимися предмет торгов может быть продан единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (претендент на покупку), при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Затраты на организацию и проведение публичных торгов в электронной форме составили: стоимость размещения объявления в газете «Звязда» согласно счет-фактуре; аукционный сбор по лоту № 1 – 2 % от цены реализации имущества; по лотам №№ 2, 3 – 5 %; за размещение объявления о проведении торгов в базе данных ЕГРСБ 240,00 бел. руб.; 320,00 бел. руб. за оценку по каждому объекту недвижимости.

Срок подписания договора купли-продажи: в течение пяти рабочих дней со дня проведения аукциона.

Срок и порядок оплаты (условия оплаты) предмета электронных торгов: в течение 5 (пяти) рабочих дней с даты проведения электронных торгов.

Чужога болю не бывае

ДЗІЦЯЧЫ ЛІСТ-СПОВЕДЗЬ ДАЙШОЎ БЕЗ МАРКІ

«Хачу, каб мама больш не сыходзіла, а бабуля не піла...» Такое пажаданне ў лісце да Дзеда Мароза напісала дзевяцігадовая Таня (імёны дзяцей зменены з этычных меркаванняў) з Рагачова. Пасланне чацвёртакласніца нікуды не адсылала, а пакінула пад ёлкай у фае раённай бальніцы. Навагодняе дрэўца ўпрыгожылі для святочнага настрою, яно ж неспадзявана «перадало» гісторыю маленькага чалавека, які быў вымушаны сустракаць Новы год адзін, не ведаючы, ці ўбачыць увогуле сваіх родных.

У педыятрычным аддзяленні Рагачоўскай раённай бальніцы напярэдадні самага дзіцячага свята ў свеце прывезлі пяцёра малых. Чацвёра дзяцей з адной сям'і: дзевяцігадовая дзяўчынка і трое яе брацікаў — шасці, чатырох і трох гадоў. Яшчэ адзін хлопчык — васьмігадовы Дзіма з адной з вёсак раёна. Гэтыя дзеці не захварэлі. У бальніцы Новы год ім давялося сустракаць з-за «каранціну». Гэта стандартная працэдура пасля таго, як непаўналетняга органы апекі вымушаныя з аб'ектыўных прычын забраць з сям'і. Ён знаходзіцца ў бальніцы да рашэння камісіі: вярнуць дзіця дадому або накіраваць у сацыяльна-педагагічны цэнтр.

На памяці медыкаў педыятрычнага аддзялення райбальніцы ўпершыню дзеці на такім «каранціне» засталіся ў бальнічных сценах на Новы год. Усе, вядома, імкнуліся іх падтрымаць.

Раніцай медсёстры знайшлі ў холе пад ёлкай лісты Дзеду Марозу. Аказалася, напісала пасланні тая самая пяцёрка малых. Школьнікі склалі пісьмы самі, дапамаглі напісаць і самаму маленькаму. Дзяўчынка паспрабавала ўпрыгожыць, як магла, сваё пасланне, якое аказалася больш падобнае не на заказ падарункаў, а на крык душы.

— Медсёстры, што былі на зменe, чыталі і плакалі, — расказвае **старшыня пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі Рагачоўскай ЦРБ Людміла АМЯЛЮСІК.**

Старэйшая медсястра педыятрычнага аддзялення Таццяна ІВАНЭКА вылажыла фота дзіцячых пасланняў у рабочым чаце ў сацыяльнай сеткі. Прапанавала стаць «Дзедам Марозам» для дзетак. За суткі сястрычкі, што працавалі ў тую змену, сабралі больш як 400 рублёў.

— Старэйшыя медсёстры стаматалагічнай паліклінікі, радзільнага дома, педыятрычнага аддзялення і іх медсёстры вырашылі скінуцца і купіць менавіта тое, пра што дзеці напісалі ў сваіх лістах, — дадае Людміла Амялюсік. — Вядома, перад Новым годам сродкаў звычайна няма — ведаеце, як у сем'ях, дзеці-ўнукі, але ўсё роўна сабралі грошы вельмі хутка. Гэта была асабістая ініцыятыва нашых медыкаў. Атрымалася, што на сам невялікі ранішнік, што традыцыйна праводзім у бальніцы для ўсіх дзяцей, якія знаходзяцца падчас свята на лячэнні, для гэтых дзетак мы падарункі купіць не паспелі, толькі лісты прачыталі.

Але павіншавалі малых якраз перад Новым годам. Уручылі дзецям, што хто заказваў: цацачную машыну на пульце кіравання, верталёт, робатаў. Хлопчыкі вельмі парадаваліся.

— Мы за Таню найбольш перажывалі, яе ліст вельмі расчуліў увесь калектыў, таму што там і пра дом, і пра маму і бабулю, — не хавае эмоцый Людміла Мікалаеўна. — Дзяўчынка прасіла пра асабістае, каб мама не сыходзіла, а бабуля больш не піла. Але дзіця хацела на свята тэлефон. У калектыве гэта не праблема, шмат хто прапаноўваў прынесці мабільны, якім ужо не карыстаюцца, але які ў выдатным стане. Праблема ў падключэнні да інтэрнэту і менавіта ў далейшай аплаце тэлефоннай сувязі, а яшчэ — у бяспецы школьніцы ў сетцы Інтэрнэт. Таму што ўвогуле тады быў няясны далейшы лёс дзяўчынкі і яе брацікаў.

Вырашылі падарыць ад сябе. Медсёстры, якія паспелі паназіраць за дзяўчынкай, заўважылі, што яна выдатна малюе і нават відаць, што ў яе свой стыль як у маленькага мастака. Набылі набор для малявання, а яшчэ спартыўны касцюм, красоўкі. На грошы, якія засталіся, купілі ўжо тое, што пасля папрасіла дзяўчынка — модную і цёплую зімнюю куртку.

На памяць медыцынскім сёстрам, што ў свята цудаў выратавалі надзею на лепшае для цэлай сям'і, цяпер засталіся толькі фота ў тэлефонах з віншавання дзяцей. Напярэдадні Раства Таня і яе брацікі вярнуліся дадому, да роднай маці.

— Медсёстры, — перадае сваімі словамі настрой калектыву прафсаюзны лідар, — за сям'ю перажываюць, але ўпэўненыя, што не асуджэнне, а спагада і падтрымка ў цяжкай жыццёвай сітуацыі вернуць родным гэтых дзяцей веру ў людзей, разуменне, што ўсё ў жыцці можна паправіць, калі захацець.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.

У тэму

Як адзначыла **старшыня Гомельскай абласной арганізацыі Беларускага прафсаюза работнікаў аховы здароўя Надзея ЗІМІНА**, напярэдадні навагодніх свят прафсаюз медыкаў Гомельшчыны накіраваў у шэсць дзіцячых лячэбных устаноў рэгіёна дапамогу на 16 тысяч рублёў. Падарункавыя сертыфікаты атрымалі Гомельскія абласныя Дом дзіцяці, дзіцячая бальніца, дзіцячы цэнтр медыцынскай рэабілітацыі «Верасок», дзіцячая бальніца медыцынскай рэабілітацыі «Жывіца», Мазырская гарадская дзіцячая бальніца, Гомельская гарадская цэнтральная дзіцячая паліклініка. Спонсарская дапамога будзе накіравана на ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы дзіцячых лячэбных устаноў, у тым ліку на закупку неабходных сродкаў гігіены, мэблі, бытавой тэхнікі, спартыўнага і гульнявога інвентару. Акрамя таго, матэрыяльную дапамогу да Новага года ад абласнога прафсаюза медыкаў атрымалі 334 супрацоўнікі — члены галіновага прафсаюза, якія маюць дзяцей-інвалідаў да 18 гадоў. На падтрымку гэтых сем'яў было накіравана звыш 10 тысяч рублёў.

ЗАВІТАЕМ У ГОРАД РАДАСЦІ?

Гэты незвычайны горад ажыў усяго на пару тыдняў. У кожным яго закутку віруе жыццё. На «гарадской плошчы» не сціхае музыка: выступаюць разнастайныя творчыя калектывы, лаўрэаты шматлікіх конкурсаў і пачаткоўцы. Спевакі, музыканты, танцоры падрыхтавалі нумары, якія сапраўды задаюць святочны калядны настрой. У «скрыпторыі» можна даведацца пра гісторыю славянскага пісьменства, напрыклад, пра пасланне, пакінутае асветнікамі ў кірылічным алфавіце (літары тут падабраны невыпадкова, за кожнай з іх — сваё значэнне). Цікаўных гасцей вучаць друкаваць на старацаркоўнай мове альбо выводзіць пяром мудрагелістыя літары, як гэта ў даўніну рабілі перапісчыкі кніг.

Ахвотныя разглядаюць выстаўку старажытных калядных паштовак. Мода на іх прыйшла на нашы землі з Англіі ў 90-х гадах XIX стагоддзя.

Малыя бягуць на спектаклі, кінапаказы, у міні-заапарк, удзельнічаюць у гульнях і майстар-класах. Госці выразаюць анёлаў, спрабуюць намаляваць храм, стварыць свой мультфільм ці зрабіць уласнымі рукамі падарункі з розных матэрыялаў. Гудзе кірмаш. Тут знойдзеш абразы, кнігі, званочкі, упрыгожанні, сувеніры, прысмакі, манастырскія хлеб, сыр, квас і мёд, свечкі, наборы гаючых чаёў, бальзамаў, мазяў, настоек і іншых карысных натуральных прадуктаў. Працуе і манастырская трапезная.

У «Здраўніцы» выступаюць медыкі, псіхолагі, свяшчэннікі.

Так падчас V Міжнароднага праваслаўнага фестывалю «Радасць», які ладзіўся па ініцыятыве Свята-Елісавецінскага манастыра пры падтрымцы Мінгарвыканкама, выглядаў сталічны Палац мастацтваў. У Мінск з'ехаліся прадстаўнікі розных храмаў з Беларусі, Расіі, Украіны, Босніі і Герцагавіны, Сербіі ды іншых краін.

Калядныя сакрэты

Галоўная місія фестывалю — вярнуць людзям Раство. Сапраўднае, чароўнае, светлае. На жаль, за паўсядзённай мітуснёй забываюцца не толькі традыцыі — знікаюць сэнсы, закладзеныя ў гэта хрысціянскае свята.

Фестываль дапамагае паглыбіцца ў гісторыю. Тут працуе гістарычная зона, дзе на інтэрактыўных панэлях можна даведацца ў тым ліку і пра малавядомыя факты, паглядзець на здымкі пячоры, дзе нарадзіўся Хрыстос, сёння там працуе храм. Далучаюся да экскурсіі па гісторыі Раства, калі культарганізатар сястра Еўдакія Сапега расказвае, як Маці Божая і Іосіф прыйшлі ў Віфлеем на перапіс насельніцтва і ў атэлях для іх не знайшлося месца. Насамрэч у той час у Віфлееме ў гасцініцах было холадна, і парадзіха атрымала самы цёплы куток. Жывёлы сваім дыханнем сагравалі пячору...

Тут можна даведацца, як Раство сустракаюць у розных краінах. Напрыклад, грэкі ў гэта зімовае свята ўпрыгожваюць не ёлку, а караблікі. У сербаў традыцыйным дрэвам стаў дуб: на свята ў дамах з'яўляюцца альбо ссечаныя маладыя дрэўцы, альбо галінкі. А яшчэ ў Сербіі пякуць калядны хлеб — чэсніцу, на свята мужчыны нясуць асвячаць яго ў храмы. З вясёлымі песнямі і скокамі Раство сустракаюць праваслаўныя ў Афрыцы, і перш чым зайсці ў храм, яны здымаюць абутак...

Свае традыцыі былі і ў славян. «Да нас дайшоў толькі паганскі спосаб святкавання Каляд, з Казой і іншымі карнавальнымі персанажамі, — заўважае Еўдакія Сапега. — Насамрэч сустракалі не толькі так. Раней багата было прыходаў, у многіх вёсках стаялі храмы, і свяшчэннік пасля службы ішоў па хатах вернікаў, віншаваў, пытаўся пра патрэбы. Праваслаўныя калядавалі з віфлеемскай зоркай, гэтыя госці сімвалізавалі анёлаў, якія абвяшчаюць аб Нараджэнні Хрыста. Чаму б не аднаўляць і гэту прыгажосць?

На шляху ў храм

Фестываль пераглядае стэрэатыпнае мысленне аб манастырскім жыцці. Напрыклад, пры Свята-Елісавецінскім манастыры сёння працуе больш за два дзясяткі майстэрань. Здавён манастыры былі месцамі, дзе развівалася культура (ствараліся абразы і перапісваліся кнігі), тут лячылі людзей. І сёння гэтыя функцыі не страчаныя. Сюды прыходзяць людзі, якія раней у мірскім жыцці былі дактарамі ці спартсменамі, і яны могуць падзяліцца ведамі, як захаваць сваё здароўе, не толькі духоўнае, але і фізічнае. Тут аднаўляюцца старажытныя рэцэпты. Нават каранавірус у манастырах не такі згубны, і не толькі дзякуючы манастырскім зялёным аптэкам. Тут няма страху перад «моднай хваробай». Паніка, псіхалагічны настрой уздзейнічаюць на чалавека, паралізуюць, падрываюць імунітэт. Тут упэўнены, што трэба больш намаганняў аддаваць не ізаляцыі, а здароваму ладу жыцця, спорту, харчаванню. І асобныя парады можна было атрымаць на фестывалі. Каранавірус прывёў да таго, што людзі думаюць пра цела, а забываюцца пра душу. Ці правільна робіць грамадства, калі старыя аказваюцца ў адзіноце, пакінутыя роднымі, пазбаўленыя сустрэч з тымі, каго любяць?

«Беражыце дзяцей ад гаджэтаў. Яны забываюць у дзецях здольнасць бачыць натуральную прыгажосць», — папярэджваў на фестывалі дыякан Дзмітрый Котаў. Ён прыехаў у Беларусь з Расіі, каб падзяліцца з дзеткамі мастацкімі сакрэтамі, правёў з малымі майстар-класы па вырабе мазаічных карцін і маляванні акварэллю і гуашшу. Айцец Дзмітрый мае прафесійную мастацкую адукацыю і некалькі дзясяткаў гадоў займаецца з дзецьмі творчасцю, кіруе ўнікальнай школай мазаікі. Ён упэўнены, што кожнае дзіця геніяльнае, але, каб раскрыць гэта, з малымі трэба многа займацца.

І шлях у храм — гэта таксама магчымасць лепш зразумець сябе, свае вытокі і місію. Фестываль мог толькі даць асобныя падказкі, адкрыцці, знаёмствы. Пасля яго заканчэння можна працягнуць шукаць свой «горад радасці». Напрыклад, наведваць майстэрні пры манастыры ці вадзіць дзяцей у храм на духоўна-патрыятычныя заняткі, з малымі тут нават ходзяць у паходы і ладзяць касцюміраваныя квэсты.

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

СТУДЗЕНЬ

п	а	с	ч	п	с	н
					1	2
3	4	5	6	7	8	9
10	11	12	13	14	15	16
17	18	19	20	21	22	23
24	25	26	27	28	29	30
31						

ЛЮТЫ

п	а	с	ч	п	с	н
	1	2	3	4	5	6
7	8	9	10	11	12	13
14	15	16	17	18	19	20
21	22	23	24	25	26	27
28						

САКАВІК

п	а	с	ч	п	с	н
	1	2	3	4	5	6
7	8	9	10	11	12	13
14	15	16	17	18	19	20
21	22	23	24	25	26	27
28	29	30	31			

КРАСАВІК

п	а	с	ч	п	с	н
				1	2	3
4	5	6	7	8	9	10
11	12	13	14	15	16	17
18	19	20	21	22	23	24
25	26	27	28	29	30	

МАЙ

п	а	с	ч	п	с	н
						1
2	3	4	5	6	7	8
9	10	11	12	13	14	15
16	17	18	19	20	21	22
23	24	25	26	27	28	29
30	31					

ЧЭРВЕНЬ

п	а	с	ч	п	с	н
	1	2	3	4	5	
6	7	8	9	10	11	12
13	14	15	16	17	18	19
20	21	22	23	24	25	26
27	28	29	30			

ЛІПЕНЬ

п	а	с	ч	п	с	н
				1	2	3
4	5	6	7	8	9	10
11	12	13	14	15	16	17
18	19	20	21	22	23	24
25	26	27	28	29	30	31

ЖНІВЕНЬ

п	а	с	ч	п	с	н
1	2	3	4	5	6	7
8	9	10	11	12	13	14
15	16	17	18	19	20	21
22	23	24	25	26	27	28
29	30	31				

ВЕРАСЕНЬ

п	а	с	ч	п	с	н
			1	2	3	4
5	6	7	8	9	10	11
12	13	14	15	16	17	18
19	20	21	22	23	24	25
26	27	28	29	30		

КАСТРЫЧНІК

п	а	с	ч	п	с	н
					1	2
3	4	5	6	7	8	9
10	11	12	13	14	15	16
17	18	19	20	21	22	23
24	25	26	27	28	29	30
31						

ЛІСТАПАД

п	а	с	ч	п	с	н
	1	2	3	4	5	6
7	8	9	10	11	12	13
14	15	16	17	18	19	20
21	22	23	24	25	26	27
28	29	30				

СНЕЖАНЬ

п	а	с	ч	п	с	н
				1	2	3
4	5	6	7	8	9	10
11	12	13	14	15	16	17
18	19	20	21	22	23	24
25	26	27	28	29	30	31

КАНФЕСІЙНЫ КАЛЯНДАР

Праваслаўны каляндар

24 красавіка — Светлае Уваскрасенне Хрыстова. Вялікдзень

Дванадзясятыя святы

7 студзеня	Раство Хрыстова
19 студзеня	Хрышчэнне Гасподняе
15 лютага	Стрэчанне Гасподняе
7 красавіка	Дабравешчанне Прасвятой Багародзіцы
17 красавіка	Уваход Гасподні ў Іерусалім. Вербная нядзеля
2 чэрвеня	Узнясенне Гасподняе
12 чэрвеня	Дзень Святой Тройцы. Пяцідзясятніца
19 жніўня	Праабражэнне Гасподняе
28 жніўня	Успенне Прасвятой Багародзіцы
21 верасня	Нараджэнне Прасвятой Багародзіцы
27 верасня	Уздзвіжанне Крыжа Гасподняга
4 снежня	Увядзенне ў храм Прасвятой Багародзіцы

Вялікія святы

14 студзеня	Абрэзанне Гасподняе
7 ліпеня	Нараджэнне Іаана Прадцечы
12 ліпеня	Святых першавярхоўных апосталаў Пятра і Паўла
11 верасня	Усекнавенне галавы Іаана Прадцечы
14 кастрычніка	Пакроў Прасвятой Багародзіцы

Шматдзённыя пасты

Вялікі пост	з 7 сакавіка да 23 красавіка
Пятроў пост	з 20 чэрвеня да 11 ліпеня
Успенскі пост	з 14 жніўня да 27 жніўня
Пост перад Раством Хрыстовым	з 28 лістапада да 6 студзеня 2023 года

Аднадзённыя пасты

Серада і пятніца на працягу ўсяго года, за выключэннем усёдных тыдняў і Каляднага перыяду

Навячэр'е Богаяўлення	18 студзеня
Усекнавенне галавы Іаана Прадцечы	11 верасня
Уздзвіжанне Крыжа Гасподняга	27 верасня

Усёедныя тыдні (па серадах і пятніцах посту няма)

Калядны перыяд	з 7 студзеня да 18 студзеня
Мытара і фарысея	з 13 лютага да 19 лютага
Сырны (масленічны)	з 28 лютага да 6 сакавіка
Пасхальны (Светлы)	з 24 красавіка да 30 красавіка
Траецкі	з 12 чэрвеня да 18 чэрвеня

Дні асаблівага памінання спачылых

Памінанне ўсіх спачылых, што пацярпелі ў час ганенняў	6 лютага
Субота мясапусная	26 лютага
Субота 2-га тыдня Вялікага посту	19 сакавіка
Субота 3-га тыдня Вялікага посту	26 сакавіка
Субота 4-га тыдня Вялікага посту	2 красавіка
Памінанне спачылых воінаў	9 мая
Радаўніца	3 мая
Субота Траіцкая	11 чэрвеня
Субота Дзімітраўская	5 лістапада

Каталіцкі каляндар

1 студзеня	Святой Багародзіцы Марыі
6 студзеня	Аб'яўленне Пана (Тры каралі)
9 студзеня	Хрост Пана
2 лютага	Ахвяраванне Пана
2 сакавіка	Папяльцовая серада
6 сакавіка	Першая нядзеля Вялікага посту
19 сакавіка	святога Юзафа
25 сакавіка	Звеставанне Пана
10 красавіка	Пальмовая нядзеля
17 красавіка	Нядзеля Уваскрэсення Пана
24 красавіка	Свята Божай Міласэрнасці
26 мая	Унебаўшэсце Пана
5 чэрвеня	Спасланне Духа Святога
9 чэрвеня	Езуса Хрыста, Найвышэйшага і Вечнага Святара
16 чэрвеня	Найсвяцейшага Цела і Крыві Хрыста
23 чэрвеня	Нараджэнне св. Яна Хрысціцеля
24 чэрвеня	Найсвяцейшага Сэрца Пана Езуса
29 чэрвеня	Святых апосталаў Пятра і Паўла
6 жніўня	Перамяненне Пана
15 жніўня	Унебаўзяцце Найсвяцейшай Панны Марыі
8 верасня	Нараджэнне Найсвяцейшай Панны Марыі
14 верасня	Узвышэнне Святога Крыжа
29 верасня	Святых Арханёлаў
1 лістапада	Усіх Святых
2 лістапада	Успамін усіх памерлых вернікаў
27 лістапада	Першая нядзеля Адвэнту
8 снежня	Беззаганнае Зачацце Найсвяцейшай Панны Марыі
25 снежня	Нараджэнне Пана
30 снежня	Святой Сям'і

Лютэранскі каляндар

1 студзеня	Новы год, Абразанне і нарачэнне імя Ісуса
6 студзеня	Богаяўленне, Эпіфанія
2 лютага	Стрэчанне Гасподняе
2 сакавіка	Папяльцовая серада, пачатак Пакутнага часу
25 сакавіка	Дабравешчанне Прасвятой Багародзіцы
10 красавіка	Вербная нядзеля
14 красавіка	Вялікі чацвер, Дзень усталявання Прычасця
15 красавіка	Пакутная пятніца
17 красавіка	Вялікдзень
26 мая	Узнясенне Гасподняе
5 чэрвеня	Пяцідзясятніца, свята сашэсця Святога Духа
12 чэрвеня	Тройца, свята Святога Трыадзінства
24 чэрвеня	Свята нараджэння Іаана Хрысціцеля
25 чэрвеня	Дзень Аўгсбургскага веравызнання
29 чэрвеня	Дзень святых апосталаў Пятра і Паўла
2 кастрычніка	Свята падзякі за ўраджай
31 кастрычніка	Дзень Рэфармацыі
16 лістапада	Дзень пакаяння і малітвы
20 лістапада	Дзень памінання спачылых. Нядзеля Вечнасці
24 снежня	Куцця
25 снежня	Нараджэнне Хрыстова

Мусульманскі каляндар

3 лютага	Ноч Рагаіб
27 лютага	Ноч Мірадж
17 сакавіка	Ноч Бараат
2 красавіка	Пачатак мусульманскага посту Рамадан
27 красавіка	Ноч Аль-Кадр
2 мая	Пачатак трох дзён Свята Рамадан Байрам
8 ліпеня	Дзень Арафат
9 ліпеня	Першы з чатырох дзён Свята Курбан Байрам
30 ліпеня	Пачатак Новага 1444 года па ісламскім летазлічэнні
8 жніўня	Дзень Ашура
7 кастрычніка	Мавлід ан-Набі, дзень нараджэння Прарока Мухамада

Іўдзейскі каляндар

17 студзеня	Ту бі-Шват
16 сакавіка	Пост Эстэр
17 сакавіка	Пурым
16 красавіка	Песах (з вечара 15 красавіка да вечара 23 красавіка)
28 красавіка	Йом а-Шаа, Дзень Катастрофы
15 мая	Песах Шэні
5 чэрвеня	Шавуот (з вечара 4 чэрвеня да вечара 6 чэрвеня)
7 жніўня	Пост 9 Ава
26 верасня	Рош ха-Шана. Яўрэйскі Новы год
5 кастрычніка	Ём Кіпур
10 кастрычніка	Сукот (з вечара 9 кастрычніка да вечара 16 кастрычніка)
17 кастрычніка	Шміні Ацэрэт
18 кастрычніка	Сімхат Тора
19 снежня	Ханука (з вечара 18 снежня да вечара 26 снежня)

Сядзі і глядзі

ТАНАЛЬНАСЦЬ ВЫХАДНОГА ДНЯ

Калі настрой не супадае з датай на календары, то часам знайсці яго ўдаецца, напрыклад, за праглядам навагодняга кінафільма альбо далучыўшыся да опернага мастацтва. На «Беларусь 3» у гэтыя выхадныя запланаваны цікавы эфір са святочнымі акцэнтамі.

Раніцай у суботу 8 студзеня на сацыякультурным канале ўбачым мастацкі фільм «Навагоднія прыгоды Машы і Віці». Атмасфера цудаў, у якую пераносіць гледачоў дзея кінастужкі, нагадвае нам пра галоўнае: свята заўсёды хаваецца ў нас самых. Днём аўдыторыю чакае паказ оперы Нацыянальнага акадэмічнага тэатра оперы і балета «Дзікае паляванне караля Стаха» Уладзіміра Солтана. Пра самога кампазітара будзе магчымасць даведацца падчас прагляду праграмы «Кампазітары Беларусі» і праекта «Люблю і памятаю». А пад вечар у эфіры прагучыць канцэрт ансамбля народнай музыкі «Бяседа» «Вітаем Новы год». Знайдзіце сваю танальнасць для свята!

Алена ДРАПКО.

СВЯТА СА СЛОВАМ БОЖЫМ

Сустрэць Каляды ў коле блізкіх, а галоўнае, у шчырай малітве — найлепшы варыянт. Аднак калі абставіны не дазваляюць зрабіць тое ў храме, можна далучыцца да трансляцый святочных богаслужэнняў у эфіры беларускіх тэлеканалаў.

Вечарам 6 студзеня святочную службу на Раство Хрыстова па календары праваслаўнай канфесіі пакажа тэлеканал «Беларусь 1». Літургію ўзначаліць Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Веніямін, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі. Прамая трансляцыя са сталічнага Свята-Духава кафедральнага сабора пачнецца ў 21.50.

Раніцай 7 студзеня Уладыка Веніямін у 6.25 звернецца на «першай кнопцы» да ўсіх вернікаў са Словам, а ў 7.30 у эфіры сацыякультурнага тэлеканала «Беларусь 3» выйдзе тэматычны выпуск праграмы «Размовы пра духоўнае».

ШАШКІ («Звязда»)

Выпуск № 156

20—21 снежня ў Рэспубліканскім цэнтры алімпійскай падрыхтоўкі адбыўся Кубак Рэспублікі Беларусь па шашках-100. Перамагла каманда Гомельскай вобласці, за якую гулялі Рыгор Кулагін, Дзмітрый Шымакоў, Ганна Барашка.

№ 1 Р. Кулагін — А. Куніца

Белыя простыя шашкі: 46, 49, 41, 43, 36, 37, 38, 39, 31, 33, 34, 35, 26, 25 (14)

Чорныя простыя шашкі: 27, 28, 22, 24, 17, 18, 11, 12, 13, 14, 15, 6, 8, 10 (14)

Белыя правялі камбінацыю, знайдзіце яе.

№ 2



№ 2 Яўген Івашка (Украіна)

Белыя простыя шашкі: c1, e1, d2, f2, h2, a3, e3, g3 (8)

Чорныя простыя шашкі: h4, a5, c5, g5, b6, d6, e7, f8 (8)

У чорных дзве відавочныя слабасці: вісячая шашка в6 і простая g5, якую хочацца забраць. Але прасталінейны напад 1.gf4 аспрэчваецца ходам 1...cd4 і чорныя павінны абараніцца. Як перамагчы белым? Паспрабуйце знайсці адказ самастойна.

№ 3 Валерый Кручкоў (г. Кагарлык, Кіеўская вобласць).

Белыя простыя шашкі: 46, 44, 40, 31, 33, 27, 29, 21, 22, 23, 24 (11)

Чорныя простыя шашкі: 42, 45, 36, 37, 38, 34, 12, 13, 8, 9, 10 (11)

№ 4 Сяргей Перапёлкін (Расія)

Белыя простыя шашкі: a1, d2, a3, d4, c5, d6, f6, e7 (8)

Чорныя простыя шашкі: f2, b4, f4, a5, b8, f8, h8 (7)

Наступныя дзве пазіцыі складзены вядучым аддзела па правілах бразільскіх шашак.

№ 5

Белыя простыя шашкі: e1, c3, g3, h4, c5, b6 (6)

Чорныя простыя шашкі: e3, e5, a7, d8, чорныя дамкі: g1 (5)

№ 6

Белыя простыя шашкі: c1, b2, g3, f4, d6, c7 (6)

Чорныя простыя шашкі: h2, a3, e5, a7, g7, b8 (6)

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць. Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

Праверце свае рашэнні:

Выпуск № 154 ад 10.12.21.

№ 145 f4, f8, e3(f2 A) d4(e5) c1, g3, e7(d4) f8(e3) c5(d2) b6, e1 +

A (f6) d6(e7 B) h6xc1(f2 C) g3(f4) e7, d2/e1 + B (f2) d4/g3, g3, a5 + C (c5) a3, g3, b4/a5 +

№ 146 1. 20-14 44:35 2. 29:40 35:44 3. 49:40 45:34 4. 14-09 03:14 5. 19:10 05:14 6. 23-19 14:23 7. 41-37 42:31 8. 36:40 +.

№ 147 1. 24-38 35:24 2. 38:17 49:28 3. 22:35 +

№ 148 1. c1-d2 e3:c5 2. c3-d4 h6:h2 3. d4:h8 f8-g7 4. h8:c7 b8:d6 5. e1-d2+

№ 149 1. f2-g3 c3:c7 2. e7-d8 h4:d4 3. d8:g1 g5:e3 4. g1:a1 +

З лістоў чытачоў: «Дзякуем аўтарам, вядучаму і рэдакцыі за магчымасць правадзіць вольны час за любімым заняткам», — пішуць Ф. Карпей і Л. Жыхар.

1	Заливочная машина ПК-60	6 900,00	5 %	5 %

Для участия в торгах необходимо:

1. В срок до 15.00 **04 февраля 2022 года** перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY98PJCB30123042861000000933 в ОАО «Приорбанк», код PJCBBY2X, УНП 691842036, получатель – ООО «СпецРеализация».

2. Подать организатору торгов в срок с даты опубликования до 15.00 04.02.2022 заявление на участие в торгах с приложением документов, перечисленных в ст. 127 Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)». Заявление на участие в аукционе и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 9.00 до 17.00 по адресу: Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 41.

Контактное лицо для осмотра лота: Яскевич Дмитрий Васильевич, тел. 8 (029) 684-71-76.

3. В день проведения торгов перед их началом участники обязаны зарегистрироваться у организатора торгов и получить аукционные (конкурсные) номера в месте проведения аукциона.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов.

Организатор открытых торгов после опубликования извещения о проведении торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за пять дней до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену за предмет аукциона.

Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов.

Торги по конкретному предмету торгов признаются несостоявшимися в случае, если:

- заявление подано только одним участником либо не было подано ни одного заявления;
- на торги явился один из участников, либо ни один из участников не явился.

В случае если торги, проводимые в форме аукциона, признаны несостоявшимися, предмет аукциона продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, в течение 5 дней со дня их проведения. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан оплатить Организатору торгов установленное вознаграждение согласно заключенному соглашению в течение 5 дней со дня их проведения. Победитель торгов в день проведения торгов подписывает протокол по результатам торгов. Между продавцом и победителем торгов в течение 15 дней со дня проведения торгов заключается договор купли-продажи.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи, но не позднее 30 дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен (будет в последующем установлен) собранием (комитетом) кредиторов.

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	**ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703**
Продавец	**ОАО «Моготекс», г. Могилев, ул. Гришина, 87**
Оператор ЭТП	**ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 46, www.ipmtorgi.by**

Предмет электронного аукциона
Месторасположение:
Могилевская обл., г. Могилев, ул. Народная, 4

Наименование	Назначение	Общая площадь	Инвентарный номер
Здание базы РСЦ	Здание специализир. складов, торг. баз, баз материально-техниче. снабжения, хранилищ	148 кв. м	700/С-80010

Сведения о земельном участке: пл. **0,0480** га, предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания базы РСУ

Начальная цена лота с НДС 20 % – 36 708,00 бел. руб. (снижена на 30 %)

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY47BELB30120028500030226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа: ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней после проведения электронных торгов. Продавец составляет и направляет договор для подписания победителю аукциона

Условия оплаты предмета аукциона

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30** (тридцати) дней после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения и оформления участия в электронных торгах

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by Ответственность участника аукциона, его права и обязанности, штрафные санкции прописаны в соглашении о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу: www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение 5 (пять) % от цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 27.11.2021

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия

Дата и время начала и окончания электронных торгов	**Начало торгов: 18.01.2022 в 13.00. Окончание торгов: 18.01.2022 в 14.00** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов
Дата и время окончания приема заявок	Заявки на участие в электронных торгах принимаются по **17.01.2022 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by
Контактные данные	**Тел.: +375 17-280-36-37; +375 (29) 317-95-42; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by; info@ipmtorgi.by**

ООО «СпецРеализация»

объявляет о проведении открытых торгов в форме аукциона по продаже имущества ПЧУП «ПОЛИРИНГ» (УНП 101365149, г. Минск, ул. П. Бровки, д. 30, ком. 30),

находящегося в процедуре экономической несостоятельности (банкротства).

***Дата и время проведения торгов*: 08 февраля 2022 года**. Начало – 10.00. Заявки принимаются с 06 января 2022 года по 04 февраля 2022 года.
Место проведения торгов: г. Минск, пр-т Победителей, 31-1, комната переговоров ОАО «Гостиница Планета».
Организатор торгов: ООО «СпецРеализация» (УНП 691842036, 223060, Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 41), тел. 8 (029) 684-71-76.
Продавец: **ПЧУП «ПОЛИРИНГ» (УНП 101365149)** в лице антикризисного управляющего – директора Частного предприятия «Правовая компания «БелПрофКонсалт» Комса Инги Анатольевны, тел. 8 (029) 133-01-01.

№ лота	Предмет торгов	Начальная цена, рублей без учета НДС	Шаг торгов	Задаток
1	Легковой автомобиль MERCEDES-BENZ E400 4MATIC, седан, 2013 г. в., цвет белый, рег. номер 9110 НВ-7	44 800,00	5 %	5 %
2	Грузовой автомобиль FORD TRANSIT, цвет черный металлик, 2012 г. в., рег. номер АН 0392-7	15 100,00	5 %	5 %
3	Грузопассажирский автомобиль FIAT DOBLO, 2008 г. в., цвет белый, рег. номер АЕ 7068-7	5 700,00	5 %	5 %
4	Грузопассажирский автомобиль FIAT DOBLO, 2008 г. в., цвет красный, рег. номер АЕ 7067-7	6 000,00	5 %	5 %

Для участия в торгах необходимо:

1. В срок до 15.00 **04 февраля 2022 года** перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY98PJCB30123042861000000933 в ОАО «Приорбанк», код PJCBBY2X, УНП 691842036, получатель – ООО «СпецРеализация».

2. Подать организатору торгов в срок с даты опубликования до 15.00 04.02.2022 заявление на участие в торгах с приложением документов, перечисленных в ст. 127 Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)». Заявление на участие в аукционе и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 9.00 до 17.00 по адресу: Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 41. Контактное лицо для осмотра лотов: Яскевич Дмитрий Васильевич, тел. 8 (029) 684-71-76.

3. В день проведения торгов перед их началом участники обязаны зарегистрироваться у организатора торгов и получить аукционные (конкурсные) номера в месте проведения аукциона.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов.

Организатор открытых торгов после опубликования извещения о проведении торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за пять дней до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену за предмет аукциона.

Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов.

Торги по конкретному предмету торгов признаются несостоявшимися в случае, если:

- заявление подано только одним участником либо не было подано ни одного заявления;
- на торги явился один из участников либо ни один из участников не явился.

В случае если торги, проводимые в форме аукциона, признаны несостоявшимися, предмет аукциона продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, в течение 5 дней со дня их проведения. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан оплатить Организатору торгов установленное вознаграждение согласно заключенному соглашению в течение 5 дней со дня их проведения. Победитель торгов в день проведения торгов подписывает протокол по результатам торгов. Между продавцом и победителем торгов в течение 15 дней со дня проведения торгов заключается договор купли-продажи.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи, но не позднее 30 дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен (будет в последующем установлен) собранием (комитетом) кредиторов.

Чалавек — чалавеку

ПРЫКМЕТЫ ПРЫКМЕТАМІ, А НАЙЛЕПЕЙ ВЕРЫЦЬ У СЯБЕ

Каляды, Новы год, Вадохрышча... Таямнічыя зімовыя святы. У моладзі — самы час для варажбы і чакання цудаў, у нас, людзей пажылых — ну вядома ж: светлых успамінаў.

Дык вось — далёкія шасцідзясятыя ўжо мінулага стагоддзя. Я, маладзенькая зусім дзяўчына, прыйшла працаваць на завод, закахалася ў хлопца (па ўсім выглядала — узаемна) і згадзілася выйсці замуж.

Помню, як паехала з гэтай весткай дамоў, як сказала бацькам, як яны і парадаваліся, і цяжка паўздыхалі, як пыталіся, ці добра ж я падумала?.. А ўрэшце, прызналі, што гэта хлопец жэніцца, калі хоча, а дзяўчына ідзе замуж, калі бяруць. Значыць, трэба ладзіць вяселле.

Гарэлкі ў магазінах тады не купіць было. Выручыць магла самагонка.

З закускай таксама бяда невялікая: у гаспадарцы тры свінні...

Праблема ўзнікала з іншым: дзе купіць падарункі для родных жаніха, для яго братоў і сясцёр, для цётак і дзядзькаў (усе жанатыя-замужнія, значыць, і для іх жонак-мужоў), для хросных і родных бацькоў? Усяго, як мы падлічылі, патрэбна ні многа, ні мала — 30 штук. І гэта пры тым, што крамы амаль пустыя, што ў іх, калі нешта і завозіцца, то прадаецца альбо па талонах, альбо па вялікім блаце. Значыць, застаецца толькі адно — ехаць на базар.

Бацькі (светлай памяці!) уручылі мне вузельчык з прыхаванымі грашыма (сваіх я тады не зарабіла), загадалі добра схаваць і нідзе не вараніць, ды адправілі ў Ліду.

І вось мы са стрыечнай сястрой (сорак гадоў на дваіх) ужо ходзім па рынку — вышукваем, збіраем падарункі, не раўнуючы, як воран косці: там купляем дзве хусткі, там — адрэз тканіны, там — дзве мужчынскія сарочкі, там яшчэ адну...

Захапіўшыся гэтай купляй, падлікамі (колькі штук, колькі грошай...) ды пакаваннем дабра ў сумкі, мы нічога і нікога не бачым, у тым ліку — двух міліцыянераў, якія ўважліва сачылі за намі, а потым, калі мы заспяшаліся на аўтобус, раптам паўсталі наперадзе і строга «запрасілі» прайсці за імі. «Куды?», «Чаго?», «Чаму?», «За што?» — пытаемся мы з сястрой. А ў адказ чуем хіба кароткае: «У аддзяленні разбяромся».

Пакуль ішлі туды, ледзь не памерлі ад страху.

І на месцы лягчэй не стала, бо высветлілася, што хлопцы з міліцыі, убачыўшы, колькі мы чаго набіраем, вырашылі, што гэта не сабе, а на далейшы продаж, што мы з сястрой — звычайныя спекулянткі, а таму ўсе набытыя тавары належыць... канфіскаваць (!?).

Мы, вядома ж, у слёзы: «Як канфіскаваць? Гэта ж падарункі... Гэта ж да вяселля».

Я давай гаварыць, што дата яго ўжо прызначана, што ў майго жаніха дзевяць братоў і сясцёр... «А чаму не дзесяць?» — з усмешкай пытаюцца ў мяне. «Дык жаніх дзясяты», — даводзім мы з сястрой і бачым, што людзі ў форме не вераць ніводнаму нашаму слову. І тут...

Ура! Я ўспомніла, што ў мяне ёсць паперка — даведка з загса. Іх тады выдавалі ўсім, хто пісаў заяву на ўступленне ў шлюб...

Які-ніякі, але гэта быў дакумент і, на шчасце, ён спрацаваў: нам вярнулі сумкі з нашым багаццем, і мы, стомленыя, заплаканыя, з размазаным макіяжам, рушылі лавіць спадарожную машыну (аўтобус даўно сышоў), каб дабрацца дадому...

Гэта быў толькі пачатак маіх вясельных прыгод. Не абышлося без іх і далей.

Добрыя дарогі ў нашых мясцінах з'явіліся хіба ў гэтым стагоддзі, у тым — іх яшчэ не было, а бліжэй да вёскі дык і зусім — яма на яме... Плюс восень, дождж, грязь, дні кароткія...

Карацей, аўтобус з жаніхом і гасцямі ехаў доўга, аднак даехаць да хаты так і не змог. Апошнія кіламетры з тры ўся кампанія адольвала пехатой па гразі і цемры.

А мы ж — сям'я, радня, усе госці, вяскоўцы (падзея як ніяк!) — хваляваліся (гэта цяпер бы патэлефанаваў і ўсё даведаўся...), гадалі, што зрабілася... Хто-ніхто, можа, нават цешыўся, што няма жаніха, што раптам перадумаў. Яно ж і такое здаралася...

Але я чамусьці не сумнявалася: верыла, што мой Казік абавязкова прыедзе. Ці прыйдзе...

Так яно і атрымалася.

...Адбылося, адшумела вяселле ў нашай хаце. Напярэдзе была дарога (каля двухсот кіламетраў) у хату жаніха.

Не паверыце, але яна таксама пачалася з прыгод. У ноч напярэдадні ўдарыў мароз, пачалася мяцеліца, галалёд, на дарозе, адпаведна, то затор, то аварыя...

Толькі апоўначы наш аўтобус дабраўся да дома Косцевых бацькоў, дзе нас сустракалі не толькі хлебам ды соллю, але яшчэ і словамі, што звычайна ў 12 ночы вяселле для многіх гасцей ужо канчаецца, а ў нас яно толькі пачыналася.

...Вось з такімі прыгодамі я выходзіла замуж. Усе, хто ведаў пра іх, хваляваліся, перажывалі, што не зладзіцца ў нас сямейнае жыццё. Але мы з Казікам ведалі, што ўсё залежыць не ад прыкмет, не ад варажбы — ад нас саміх.

Пяцьдзясят гадоў мы ідзём па жыцці разам: падтрымліваем адно аднаго, дапамагаем, не дзелім работу на тваю і маю, радуемся дзецям, унукам, нават праўнукам!

І вось гэтага на Новы і ўсе наступныя гады хочам пажадаць усім.

Аліна Сцяпанава,

Мінскі раён.

Паміж намі, мужчынамі

ЯШЧЭ РАЗ ПРА ЛЮБОЎ

І хіба крыху — пра свінства

...Падымаючы трэцюю чарку, мы, мужчыны, часам гаворым: «Ну, за Марыю Іванаўну!» І выпіваем — кожны за сваю. А потым, здараецца, яшчэ і расказваем... Я вось таксама хачу, бо цікавыя гісторыі.

КОЛЬКІ дзяцей было ў дзядзькі Санькі, што жыў у канцы нашай вуліцы, дакладна не скажу: не тое дзесяць, не тое адзінаццаць. Многа. Але тады здзіўляла не гэта, бо шматдзетных сем'яў у вёсцы шмат было, а тое, што ў Санькі — усе дзяўчынкі. Ніводнага хлопчыка! Аднавяскоўцы-мужчыны дзядзьку падколвалі, называлі бракаробам, раілі папрасіць дапамогі ў суседзяў.

Санька, як правіла, адмоўчваўся ці аджартоўваўся, а найчасцей — адмахваўся ды спяшаўся дамоў, «да сваіх дзяўчат», з кожнай палучкі набіраў ім ладныя кулькі «падушачак» — былі такія цукеркі...

І вось Санькава жонка зноў зацяжарала. У вёсцы смяяліся, што, напэўна ж, зноў дзеўкай. Не маўчаў і сам дзядзька: ён, як і раней, казаў сваё, ужо прывычнае, «каго Бог дасць»...

І ён, нарэшце, пачуў! Людзі аж не паверылі: у Санькі хлопчык?! Няўжо?!

А Санька і сам свайму шчасцю не верыў! Мужчыны кажуць, каб у краму бег, а ён — каб хутчэй да жонкі, да дзяцей, да найменшага — пагушкаць, пялюшкі памяняць, нешта дапамагчы... А да ўсяго — палюбавацца на сваю палавіну, бо яна пасля апошніх родаў дык нават з твару змянілася! То ўвесь час у зямлю глядзела — хадзіла панурая ды заклапочаная, а то расцвіла, задрала галаву, засвяцілася радасцю! І мела з чаго: дагадзіла-такі свайму гаспадару, спраўдзіла мару пра сына.

Любіла яна Саньку. І ён яе...

У той жа год, калі ў іх нарадзіўся хлопчык, вёску абляцела яшчэ адна навіна: Віця (ён жыў на той самай вуліцы) кінуў сваю Вольку — пайшоў да маладой.

Такога ў нас даўно не было, а па тым часе дык, можа, і ніколі.

З чаго пачыналася? Ды як у многіх: Віця, малады расіянін, трапіў служыць у Беларусь, познаёміўся тут з прыгожай дзяўчынай, ажаніўся (дакладней — у прымы прыстаў) і зажыў — як дай бог кожнаму! А што — добрая работа, жонка, дзеці, у цешчы вялікі прыватны дом непадалёк ад райцэнтра...

Адно перажыванне, што прымак, што як быццам не гаспадар. Дык ён дзеля гэтага хоць розных прыбудоў наставіў. Спачатку дробных — для качак, для гусей, а потым ужо і хлеўчык з'явіўся: Віця свінства развёў. Працаваў, не ленаваўся, радаваўся, што ўсё сваё ў яго... І дом у хуткім часе — таксама (на той свет жончыны бацькі нічога не забралі), але ж...

Мусіць, нейкі чорт у рабрыну Віцю ўбіўся: «знюхаўся» з адной маладзіцай і закруціў з ёй такую любоў... Аж да разводу ў чалавека дайшло, да таго, што забраў ён рэчы і з адных прымаў падаўся ў другія — у заводскую маласямейку, дзе жыла яго новая абранніца. Яе чамусьці Экстрай звалі, як гарэлку. Мусіць, хмяліла так? Ці мазгі адбівала?..

Вольга ж засталася адна. Выйдзе, бывала, на лавачку, што каля хаты сваёй, і сядзіць — нейкія думкі думае...

А «маладым» тады — Віцю з Экстрай — хоць таксі наймай, бо адзіная сцежка да крамы каля Вользінай хаты ляжыць, каля лавачкі. Ідзеш туды, будзь ласкавы, паглядзі, які там парадачак ды прыгажосць, павітайся з гаспадыняй. Ідзеш назад...

Экстра спачатку баялася, думала, што Вольга адлупіць альбо сварыцца пачне, праклінаць за тое, што мужа звяла... Ды і Віця не гогалем міма праходзіў: угінаў галаву ў плечы, сароміўся...

А Вольга тым часам трымалася годна: і на Экстрына «здрасьце», і на Віцева «добры дзень» адказвала спакойна, як нічога ніякага. Чула ад людзей, што не вельмі і ладзяць яны, што характар у Экстры як надвор'е вясной: то як быццам цёплае, нават гарачае, а то Віця ўжо «і пень стары», «і хамут дурны», і як мужчына — анічога не варты...

Карацей, усяго ён, бедны, там наслухаўся (разам з суседзямі па маласямейцы) і, як ні цяжка было, нейкага разу не вытрымаў — паплёўся назад да Вольгі: каб пагаварыць, папрасіць прабачэння.

Па дарозе думаў, што не даруе — выганіць, як сабаку. І правільна зробіць! А яна — не: сустрэла — як некалі з работы, сабрала на стол паесці, сказала, каб потым, калі не вельмі стаміўся, загарадку ў свіней паправіў, а то дзверцы зламаліся... І ўсё.

...За жанчын выпіваюць звычайна трэцюю чарку. За асобных — згадзіцеся — варта і першую. Ці не так?

Мікалай Камароўскі,

г. Орша.

Што бачу

Старасць — не радасць...

На вясковай вуліцы сустрэліся дзве бабулькі. Адна адной скардзіцца:

— Нездаровіцца мне... Так нездаровіцца! У старасці — ліха на яе — усе хваробы чапляюцца!

— І не толькі ў старасці, — перапыняе прыяцелка. — Цяпер і маладыя нядужыя. Узяць хоць бы мяне: таксама захварэла!

Міхась Сліва, *г. Рагачоў.*

ОАО «Управление специальных строительных работ

Стройтрест № 7»

извещает своих акционеров (их представителей) о проведении 17 января 2022 г. внеочередного общего собрания по адресу: г. Минск, пр-т Машерова, д. 16, пом. 5.

ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:

1) О внесении изменений в Положение о ревизионной комиссии Общества.

2) О выплате членам совета директоров Общества дополнительного вознаграждения.

Место проведения собрания: г. Минск, пр-т Машерова, д. 16, пом. 5.
Начало работы собрания – в 11.00.
Регистрация участников собрания с 10.00 до 10.50 в день проведения собрания по месту его проведения.
Акционеру при себе иметь документ, удостоверяющий личность, представителю акционера – документ, удостоверяющий личность, доверенность или договор.
Список акционеров для регистрации участников собрания будет составлен по данным реестра акционеров на 10 января 2022 г.
Орган, созывающий собрание: совет директоров Общества, основание созыва: протокол от 04.01.2022 № 04-01/2022.
С материалами по вопросам повестки дня собрания можно ознакомиться в рабочие дни (понедельник–пятница) с 14.00 до 17.00 начиная с 05.01.2022, по адресу: г. Минск, пр-т Машерова, д. 16, пом. 5.

Совет директоров ОАО «Управление специальных строительных работ Стройтрест № 7»

УНП 100088916

Калектыў Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь смуткуе ў сувязі са смерцю Расціслава Мікалаевіча ЛЕТУНА.

Расціслаў Мікалаевіч быў адданы гандлёвай справе. Узначальваючы ўпраўленне арганізацыі спажывецкага рынку тавараў культурна-бытавога і гаспадарчага прызначэння, ён быў прыкладам прафесіяналізму і мэтанакіраванасці, мудрасці і працавітасці для маладога пакалення.

Выказваем спачуванне родным і блізкім Р. М. Летуна ў сувязі з горам, якое іх напаткала, і падзяляем іх смутак.

Страчаная спадчына

ВЯРТАННЕ З НЕБЫЦЦЯ

Бялыніцкая мастачка Ларыса ЖУРАВОВІЧ аднавіла выгляд зніклых храмаў па расказах відавочцаў і архіўных дакументах

Жыццё нашых продкаў было не зусім такім, як думаюць некаторыя. Нашы бабулі і дзядулі працавалі шчыра, адпачывалі з душой, а галоўнае — верылі ў Бога. Такой вось парой, як гэта, прыбіраліся ў святочныя сукенкі і кашулі і ішлі на ўсяночную ў храм. Бо без гэтага Раство нават і ўявіць не маглі. Усе да аднаго радаваліся, славілі Усявышняга і прасілі ў Яго шчасця для сябе і блізкіх. Месцы, дзе стаялі храмы, і дагэтуль прасякнутыя моцнай энергетыкай, нават калі ад іх не засталося і следу. Дзякуючы таленту Ларысы ЖУРАВОВІЧ і цікаўнасці яе сужэнца Вячаслава, частка такой народнай спадчыны вярнулася з небыцця. Гэтыя храмы вы больш нідзе не ўбачыце, акрамя работ бялыніцкай мастачкі, нават у энцыклапедыях. Праект зусім новы, але ўжо няма не толькі храмаў, але і некаторых з апошніх сведак, якія пра іх успомнілі. Таму гэта памяць яшчэ і пра людзей. Нездарма цыкл называецца «Вяртанне».

СЯМЕЙНЫ ПРАЕКТ

З велічэзных вокнаў майстэрні Ларысы Журавовіч адкрываецца прыгожы від на Бялынічы. З аднаго боку, ціхая вясковая вуліца, з другога — маляўнічая прастора з лесам і ўзгоркамі на гарызонце. Пасярод пакоя мальберт — чакае, калі гаспадыня вернецца да яго, каб увасобіць сваю творчую фантазію. Яна ва ўсім любіць дакладнасць, да самых дробязяў. Таму яе работы ўражваюць натуральнасцю і праўдзівасцю. Яна смяецца, што нават кроп з памідорамі малюе, каб перадаць не іх выгляд, а смак. Глядзіш, і сапраўды хочацца працягнуць руку, узяць і з'есці.

Калі Ларысе Журавовіч прапанавалі зрабіць вялікую персанальную выставу да Дня пісьменства ў Бялынічах, яна задумалася. Хапала і таго, што ўжо было зроблена, але Вячаслаў параіў звярнуцца да гістарычнай тэмы. Прапанаваў зафіксаваць тое, што яшчэ нядаўна было сэнсам жыцця нашых продкаў, а цяпер ціха сыходзіць у вечнасць, не пакідаючы нават следу. Ці можна ўявіць наша мінулае без храмаў? Іх шмат пабудавана новых — з сучасных матэрыялаў. А вось тыя намаленыя, з драўлянымі сценамі і немудрагелістым убраннем знікаюць. Хоць бы памяць засталася... Ларысе і Вячаславу спатрэбілася паўтара года, каб аб'ехаць вёсачкі раёна, знайсці і распытаць відавочцаў і аднавіць тыя храмы прынамсі на кардоне.

— Так цудоўна, што мы пачалі гэтым займацца яшчэ да пандэміі, — кажа Ларыса. — Інфармацыю збіралі па крупінках. Апыталі ўсіх людзей сталага веку, краязнаўцаў, журналістаў, настаўнікаў. Абышлі школьныя музеі, аблазілі ўвесь інтэрнэт, перагарталі энцыклапедыю Анатоля Кулагіна па архітэктуры Беларусі. Большасці тых храмаў, якія я намалявала, там, дарэчы, не знайшлося. Нават у раздзеле «Страчанае».

ЦЭРКВЫ НА КАМЯНЯХ

Наогул на тэрыторыі раёна засталося няшмат культавых пабудоў. На могілках у вёсцы Аксенькавічы Запольскага сельсавета з далёкіх часоў захавалася драўляная капліца. Падлога — земляная, толькі старыя дошкі на даху замянілі шыферам. Унутры нічога лішняга — абразы ды ручнікі. Напамін пра тое, што, акрамя малітвы і ціхага бласлаўлення, чалавеку нічога больш не патрэбна. Глядзіш і адчуваеш: перад табой — вечнасць. Мастачка перадала не толькі кожную дробязь капліцы, але і дух, які там пануе.

Гэтая капліца адна з найстарэйшых на тэрыторыі раёна, і яна дастаткова добра захавалася. А вось ад капліцы ў вядомых сваёй загадкавасцю Эсьмонах засталося толькі пяць вянкоў са зруба.

— Са Славай абышлі ўсіх старажылаў і ўсё ж такі знайшлі відавочцаў, — дзеліцца Ларыса. — Нам таксама расказалі, што калі чалавек паміраў, яго адразу ж пераадзявалі і неслі туды. Там ён і начаваў. Непадалёку ад той каплічкі мы знайшлі магілу нейкай паненкі з прыгожым помнікам.

Заазер'е ў Бялыніцкім раёне — наогул мясціна таямнічая. Дастаткова згадаць тамтэйшы «Стоўнхендж». Крыж з каменю, і вакол яго мноства валуноў з надпісамі. Была там царква ці не, невядома. Але месца дакладна сакральнае. Таму Ларыса вырашыла намаляваць і яго.

У Сялянскай Клёўцы, што недалёка ад Эсьмонаў, таксама была царква на камянях. Даследчыкам пашчасціла знайсці жанчыну, якая расказала, што там была прыбудова з такім жа, як і на самой царкве, шатровым дахам. А на ўваходзе ляжаў вялікі камень замест прыступкі.

— Эсьмонскія могілкі наогул незвычайныя, — удакладняе Ларыса. — Там на магілы заўсёды клалі камень. І калі глядзіш на гэтыя старыя могілкі — спрэс адны камяні. У той жа Карытніцы, напрыклад.

ПАСПЕЦЬ ЗАНАТАВАЦЬ

Мясцовыя краязнаўцы білі сябе ў грудзі, даказваючы, што ў Антонавай Будзе ніколі не было царквы. А вось Ларысе з мужам удалося знайсці людзей, якія яшчэ помнілі тую царкву. Цяпер на тым месцы кар'ер. Жанчынам, якія падзяліліся апісаннем той пабудовы, было ўжо за 90. Адна ўспомніла агульны выгляд, а другая падрабязна апісала ганак і расказала пра кветкі, якія раслі злева ад яго. Магчыма, яны памыліліся ў нейкіх дэталях, але ў цэлым атрымалася база, якую можна ўдакладніць.

— З адной з гэтых жанчын мы сустрэліся толькі з чацвёртага разу, — успамінае Ларыса. — Ёй было 97 гадоў, і сын баяўся пускаць нас да яе, каб маці не падхапіла вірус. Але потым усё ж такі пагадзіўся. Яму прысніўся сон, як барадатыя мужыкі ў кашулях прасілі яго: зрабі нам царкву. І ён літаральна ўхапіўся за наш праект. Марыў потым на тым месцы крыж паставіць. Так гарэў жаданнем, што нават на выставу прыязджаў у Магілёў. Але здарылася непрадказальнае. Спачатку памерла бабуля, а праз два месяцы і ён. І крыж не паспеў паставіць. Вось гэта крыўдна. Яго, дарэчы, звалі Міхаіл Пятровіч Аляксейчыкаў. Цяпер лаўлю сябе на думцы, што калі б не ён і не яго маці, мы б ужо ніколі не ўбачылі царкву ў Антонавай Будзе.

КУДЫ ІДЗЕ ХРЭСНЫ ХОД

Здаецца, сам Бог дапамагаў Ларысе рабіць гэтую высакародную справу. З царквой у Задруцкай Слабадзе наогул атрымалася амаль дэтэктыўная гісторыя.

— Калі я зрабіла карціну «Вяртанне» пра хрэсны ход з Бялыніч у Задруцкую Слабаду (карціна знаходзіцца ў мастацкім музеі В. Бялыніцкага-Бірулі ў Бялынічах), задумалася, куды ж канкрэтна яны ідуць, — расказвае Ларыса. — Пра царкву ў гэтай вёсцы я наогул нічога не чула. Пачала шукаць інфармацыю, і ў адным з нумароў «Епархіяльных ведамасцяў», якія выходзілі ў 1870-я гады, прачытала, што там замест старой царквы быў пабудаваны новы прыгожы храм, і ў сувязі з гэтым туды адбыўся хрэсны ход з прадстаўнікамі вялікага свяшчэнства. Мы абышлі шмат людзей, каб даведацца пра тую царкву. Спачатку не шчасціла, ніхто нічога не памятаў, расказвалі толькі, што там быў склад. Але потым пазнаёміліся з Міхаілам Хадкевічам, які калісьці жыў побач з той царквой. І ён прыгадаў, як дзіцем лазіў па яе даху. Успомніў, што побач з пабудовай меліся прывязі для коней, а адразу за ёй знаходзіліся могілкі. І нават пра гняздо бусла. Блытаўся толькі з апісаннем ганка. Потым мы знайшлі жанчыну, якая сказала, што ён быў з калонамі. Яна гэта дакладна запомніла, таму што малой хавалася за імі. Расказала таксама, што на даху царквы была маленькая макаўка. Потым у Алешкавічах знайшоўся яшчэ адзін сведка, які ўдакладніў, што купал быў васьмігранны.

Аналагічна, паводле расказаў, адноўлены і выгляд храма ў Круках Вішоўскага сельсавета. Жанчыну, якая яго апісала, знайшлі ў Магілёве. Калі Ларыса прывезла ёй эскіз, тая паглядзела і з адабрэннем сказала: от, маладзец.

— Магчыма, купал там быў і не жоўты, гэта ўжо мая версія, — усміхаецца аўтарка. — Але царква дакладна была блакітнага колеру. Відавочца ўспомніла ўсё: і як выглядалі дзверы, і колькасць вокнаў, і нават іх форму. І гэта нягледзячы на свае паважаныя 95 гадоў. Такія людзі — сапраўдны скарб для даследчыка.

ЗАМЕСТ ХРАМА — ЦЕНЬ

У цэлым цыкл «Вяртанне» складаецца з 30 работ. На жаль, з 18 храмаў, якія існавалі на пачатак XX стагоддзя на тэрыторыі Бялыніцкага раёна, два аднавіць не атрымалася. Вядома, што яны былі, але сведак не знайшлося. Храмы разбурылі яшчэ ў 1930-я гады. Але Ларыса ўсё роўна зрабіла карціны — без пабудоў.

— Вось гэта — сучасная Каліноўка, раней Царковішчам называлася, — паказвае яна адну з работ. — Калі малявала цень ад дрэваў, нечакана злавіла сябе на думцы, што яна падобная на царкву. Калісьці тая якраз тут і стаяла, а калі знеслі, паставілі крыж. Сёння — ні царквы, ні крыжа. Калі ўсё зарасце, ніхто і не здагадаецца, што тут нешта было.

— Ёсць відавочца з Бялыніч, які расказвае, што гукі ад звона ў Царковішчах былі чутныя нават тут, у горадзе, за 20 кіламетраў ад вёскі, — дадае Вячаслаў. Сам ён, дарэчы, родам якраз з тых краёў.

Не атрымалася таксама аднавіць выгляд і каталіцкага касцёла ў Мяжонцы.

— У нас было няшмат каталіцкіх драўляных касцёлаў на камянях, вельмі шкада, што мы не можам даведацца, як ён выглядаў, — перажывае Ларыса. — Застаўся толькі падмурак, падзелены на тры часткі. Кажуць, тут калісьці стаяў яшчэ і крыж. У 1930-я гады пабудову разабралі.

НАЙЛЕПШАЯ ПАТРЫЯТЫЧНАЯ

Серыя карцін з храмамі ўжо экспанавалася ў музеях Мінска, Магілёва і Бялыніч. Напярэдадні Новага года Ларысе прапанавалі паўдзельнічаць з гэтым праектам у конкурсе Міністэрства культуры Беларусі, прысвечаным Году народнага адзінства. У выніку ён стаў пераможцам у намінацыі «Найлепшы твор графікі патрыятычнай тэматыкі».

— Гэта вельмі знамянальна, — падзялілася радасцю Ларыса Журавовіч. — Храмы былі сапраўднымі цэнтрамі культуры жыцця на вёсцы.Тут спалучалася ўсё — і жывапіс, і архітэктура, і нават адукацыя. Бо пры храмах працавалі царкоўнапрыходскія школы. Уяўляеце, наколькі насычаным было тое жыццё! Мы ж сваё мінулае ўяўляем па асобных фактах ад сваіх родных і пасавецкіх фільмах пра калгасы. Але поўную карціну не ведаем. Гісторыя вёскі нашмат багацейшая. Калі б у мяне была магчымасць трапіць туды і намаляваць усё як было, я ні хвіліны бы не разважала. Для мастака гэта быў бы сапраўдны падарунак. Вельмі шкада, што мы не захоўваем сваю народную самабытнасць, успамінаем толькі пра тое, што наша вёска была лапцюжнай, з сахой і гарэлкай. Але яна была рознай. І паненкі на лодках плавалі, і млыны працавалі, і на конях ездзілі. А цяпер што ў вёсках засталося? Яны ўсе сталі, як клоны: адна на адну падобныя. Трэба капнуць глыбей, паспрабаваць даведацца больш пра мінулае. Тады нічога і прыдумваць не спатрэбіцца. Будзем толькі здзіўляцца, наколькі мы багатыя.

Нэлі ЗІГУЛЯ,
фота аўтара.

г. Бялынічы.

КАБ ЯЕ НАД КРЫНІЦАЮ МОГ НАЗВАЦЬ ЧАРАЎНІЦАЮ

Матушка з Кобрына стварае шыкоўныя льняныя ўборы ў нацыянальным стылі

За два дні да новага года ў Нацыянальнай школе прыгажосці прайшоў вялікі калядны модны паказ Christmas Fashion Show. Гэтым разам ён адбыўся пры падтрымцы Міністэрства замежных спраў Беларусі. Па подыуме прайшлі мадэлі ў адзенні з калекцый многіх вядомых у краіне брэндаў. Сукенкі з калекцыі «Ладушка» кобрынскай майстрыхі Марыны БАНІФАЦЬЕВАЙ выклікалі асаблівае замілаванне ў гледачоў.

Калекцыя «Ладушка», у цэнтры — Марына БАНІФАЦЬЕВА.

АД ШКОЛЬНАГА КАМБІНАТА ДА ПАКАЗУ Ў ЧЫКАГА

А мінулым летам дзяўчаты ў кобрынскіх вышыванках правялі паспяховае дэфіле ў амерыканскім Чыкага. Там праходзіў адзін з этапаў інтэрнацыянальнага фестывалю моды, арганізаваны Рускай праваслаўнай царквой. Беларусаў туды запрасілі ўпершыню. І вышытыя Марынай Баніфацьевай сукенкі з традыцыйнымі беларускімі ўзорамі гледачы ўспрынялі вельмі хораша і сардэчна.

Сама Марына Іванаўна ў Чыкага не была, «гастралявалі» толькі яе сукенкі.

— Тая калекцыя называецца «Чараўніца», — гаворыць Марына. — Яна і цяпер падарожнічае па Злучаных Штатах дзякуючы мадэльнай школе нашай зямлячкі Юліі Калбыкі. Школа ўдзельнічае ў розных фестывалях і паказах, а беларускія сукенкі, як высветлілася, прыйшліся даспадобы заакіянскаму гледачу. Яшчэ адна наша сукенка пабывала сёлета на конкурсе прыгажосці ў турэцкай Анталіі. Яе дэманстравала адна з удзельніц конкурсу «Міс Еўразія — 2021».

Марына Баніфацьева, матушка з Кобрына, — цяпер вядомы ў нашай краіне дызайнер адзення ў народным стылі. А дваццаць гадоў таму яна была толькі жонкай святара і рэгентам дзіцячага хору ў кобрынскім Свята-Аляксандра-

Неўскім саборы. Адукацыю рэгента атрымала ў духоўнай семінарыі. Ну а шыто ды вышыўка заўсёды былі яе хобі. І кваліфікацыю швачкі набыла яшчэ ў школьным вучэбна-вытворчым камбінаце.

ВУЧЫЛАСЯ НА СТАРАДАЎНІХ РУЧНІКАХ ДЫ КАШУЛЯХ

Аднойчы захацела асабліва прыгожа апрануць мужа да службы, ну і расшыла ўбор. Тая рыза не засталася незаўважанай у асяродку знаёмых. Яе сталі прасіць пашыць кашулю альбо сукенку, дзецям нешта на святочны ранішнік. Асабліва аказаліся запатрабаваныя мужчынскія кашулі, бо раней іх у нацыянальным стылі было не знайсці ў крамах, гэта цяпер фабрыкі шыюць, фактычна ў любым універмагу можна сустрэць падобную рэч фабрычнага вырабу.

Тады ж гэта было калі не экзотыкай, дык дакладна падзеяй. Яшчэ і муж падтрымаў, сказаў: «Шый для мужчын, яны самыя неапранутыя». Першы поспех акрыліў, станавілася больш цікавасці, больш заказаў і, адпаведна, больш давялося вучыцца і развіваць уласную творчасць.

Марына пачала збіраць узоры для сваіх вышыванак па вёсках. Купляла альбо прымала ў дар старадаўнія ручнікі, фартухі, сукенкі. Шмат разоў бывала ў Маларыцкім раённым цэнтры народнай творчасці. Яго супрацоўнікі збіраюць і беражліва захоўваюць гісторыю народнага касцюма. Не раз ёй давала кансультацыі дырэктар цэнтра Валянціна Струнец. Адным словам, дзе толькі можна, вывучала ўзоры, капіравала іх, замалёўвала, каб потым адаптаваць да машыны, увесці ў праграму. Менавіта такім чынам вышыванка наносіцца на тканіну. А працуе майстрыха пераважна з аршанскім ільном. Кажа, што лён зараз у нейкай ступені як прыкмета статуснасці. Калі чалавек аддае перавагу натуральным тканінам, значыць, ён заможны.

Марына дадае, што найлепш ёй удавалася адчуць свайго патэнцыяльнага спажыўца на рознага роду святах, кірмашах. Асабліва цікавіліся вышытымі строямі на «Мотальскіх прысмаках». Аднойчы арганізавалі з мужам там сваю палатку. Людзі падыходзілі, цікавіліся, нешта набывалі. А некаторыя купілялі вышытую кашулю, тут жа апраналі яе ды ішлі на свята.

Вырабы Марыны БАНІФАЦЬЕВАЙ дэманструюць прафесійныя мадэлі.

Сапраўды, нішто так не далучыць да мотальскага фестывалю, як адзежа ў народным стылі. На гэтым фэсце ў іх з'явіліся пастаянныя кліенты. Некалькі сямейных пар расказалі, што знарок ехалі на «Прысмакі», каб набыць абноўкі ад Марыны.

Цікава, што не толькі ўдзельнікі свят з фальклорнай накіраванасцю прыглядаюцца да яе ўбораў. Асобныя байкеры на сваіх злётах палічылі вышэйшым пілатажам праехацца ў кашулі з беларускім арнаментам. Менавіта заядлы аматар матацыклаў сказаў ім аднойчы, каб не пакідалі сваёй справы, бо, паводле яго меркавання, гэта рамяство патрэбна людзям.

ТВОР МАСТАЦТВА З ХАТКАЙ

З гадамі справа развівалася, а калі вырабы Марыны Баніфацьевай паявіліся ў Мінску, неяк ёй патэлефанавала жонка аднаго з беларускіх паслоў у еўрапейскай краіне, папрасіла вышыванку. Вядома, пашыла ўбор. Потым была вядомая сукенка для Веры Паляковай, жонкі міністра замежных спраў Беларусі Уладзіміра Макея. Вера Палякова з'явілася ў гэтай сукенцы на адным з прыёмаў для прадстаўнікоў дыпламатычных місій. І тады пра яе кобрынскі ўбор не пісалі хіба толькі лянівыя. У адным з інтэрв'ю Вера Палякова расказвала: «Для мяне гэты ўбор пашыла матушка з Кобрына Марына Баніфацьева. Яна прыслала некалькі варыянтаў вышывак, мы з мужам спыніліся на беларускай хатцы — сімвале Года малой радзімы. Калі я ўбачыла гатовы варыянт — літаральна абамлела: атрымалася не сукенка-вышыванка, а сапраўдны твор мастацтва. Да гэтага строю матушка яшчэ выткала пояс і ўпрыгажэнне на галаву — неверагоднай прыгажосці рэчы з дзіўнай энергетыкай. Вы не ўяўляеце, колькі кампліментаў я атрымала з нагоды гэтага строю!»

А Марыне сталі паступаць званкі з прапановамі паўтарыць убор, вядома, за вялікія грошы. Але майстрыха адмаўлялася, бо трымае ўласную марку: у яе ад пачатку была дамоўленасць, што сукенка для Веры Аляксандраўны шыецца ў адзіным экзэмпляры. Там быў эксклюзіўны ўзор, узяты са старадаўняга ручніка.

КАБ БЫЛО ПРЫГОЖА І РАДАВАЛА

Кожны дзень Марыны Іванаўны распісаны літаральна па хвілінах: заказы, прымеркі, выезды. У яе ёсць свая невялікая майстэрня на гарышчы прыватнага дома на ўскрайку горада. А ўласны гараж муж ператварыў у дэманстрацыйную залу. Вырабы з той рамесніцкай майстэрні зараз можна купіць і ў Брэсце, і ў Мінску. У калекцыі ёсць работы з традыцыйным беларускім арнаментам, а таксама з аўтарскімі ўзорамі, навеянымі нацыянальнымі матывамі.

— Галоўнае, каб было прыгожа і людзей радавала, — гаворыць Марына. — Мы забыліся пра традыцыі народнага адзення. І страцілі нешта вельмі важнае. Калі стала вывучаць народны касцюм, упэўнілася, што продкі рабілі не толькі зручна, але і надзвычай прыгожа. У арнаменты, вышыванкі-ўзоры нашы прапрабабулі закладвалі інфармацыю, якая перадавалася з пакалення ў пакаленне, служыла своеасаблівым абярэгам ад усяго дрэннага. Думаю, што такі касцюм варта насіць не толькі адзін раз на год, калі аб'яўляецца дзень вышыванкі, але і штодня: на работу, прагулку, у падарожжы. З адпаведнымі дапаўненнямі і аксесуарамі ў такім строі можна выглядаць вельмі нават стыльна.

У звычайным жыцці Марына Баніфацьева — матушка. Яе муж — настаяцель царквы ў вёсцы Хідры Кобрынскага раёна. А яна з задавальненнем выступае перад выхаванцамі нядзельнай школы, праводзіць майстар-класы па вышыўцы і адзначае, што дзеці цікавяцца спрадвечным рамяством. Паводле яе слоў, навыкі шыцця заўсёды спатрэбяцца ў жыцці, асабліва дзяўчынкам. І яна радуецца, што шмат ахвотных прыходзіць на яе ўрокі.

А выхаванцы мясцовага дзіцячага садка не раз выступалі мадэлямі на паказах. У гэтую справу папулярызацыі беларускай вышыванкі ўключыліся таксама бацькі дашкольнікаў. Значыць, робіцца хоць маленечкі крок да вяртання свайго, народнага. Як жонку святара яе радуе, што не толькі калекцыі «Чараўніца», «Ладушка», якія атрымалі вядомасць, нясуць у свет мастацтва айчыннай вышыванкі, але і арнаменты на дзіцячых кашульках спрыяюць справе выхавання павагі і любові да роднага, спрадвечнага.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
Фота з архіва Марыны БАНІФАЦЬЕВАЙ.

МОДА БЕЗ МЕЖАЎ

Паглядзелі, як дызайнеры стваралі навагодні настрой на калядным паказе

Як і любое сапраўднае мастацтва, мода не ведае межаў. Яна аб'ядноўвае людзей розных узростаў, прафесій і нацыянальнасцяў. У апошнія дні адыходзячага 2021 года гэтая ідэя стала асновай штогадовага зімовага моднага паказу Christmas Fashion Show.



Сёлета шоу праводзілася пры падтрымцы Міністэрства замежных спраў, а на подыум нараўне з прафесійнымі мадэлямі падымаліся навучэнцы мадэльных школ самага рознага ўзросту і запрошаныя госці, а таксама дзеці паслоў і консулаў Арменіі, Грузіі, Казахстана, Кыргызстана, Малдовы, Расіі, Сербіі, Туркменістана, Таджыкістана, Украіны і супрацоўнікаў Міністэрства замежных спраў нашай краіны.

Christmas Fashion Show праводзіцца ўжо трэці раз. Праект, арганізаваны Нацыянальнай школай прыгажосці і прысвечаны зімовым святам, стаў чаканай падзеяй. Сёлета галоўнай тэмай каляднага паказу вырашана было выбраць адзінства народаў. Гэтую ідэю падтрымлівалі і музычныя нумары — на подыум падымаліся лаўрэаты творчых конкурсаў з нашай краіны, Расійскай Федэрацыі і Кітайскай Народнай Рэспублікі з сусветнымі навагоднімі і каляднымі хітамі.

У пачатку шоу вядучыя прапанавалі гледачам здзейсніць віртуальнае падарожжа па краінах і кантынентах, каб даведацца, як святкуюць Новы год у розных кутках нашай планеты. Але сваё бачанне «моды без межаў» і развіцця сучасных модных тэндэнцый прапаноўвалі менавіта беларускія дызайнеры. Гледачам былі прадстаўлены зімовыя паўсядзённыя і вячэрнія калекцыі адзення і аксесуараў ад вядомых і пачынаючых беларускіх брэндаў: Elema, «Цэнтр моды», Mari St, Garsonnier, Марыны Баніфацьевай, Надзеі Лунёвай, Валерыі Крысы, AnSur, Yuliyastylist, SMStyle, Sevenstarswear, JennyLis і інш.

ПРЫГАЖОСЦІ ЎСЕ ЎЗРОСТЫ ПАКОРЛІВЫЯ

— Christmas Fashion Show стварае святочны настрой, узнімае жыццёвы тонус і становіцца стымулам для новых здзяйсненняў, — падзялілася перад паказам **адна з мадэляў Анастасія МІРОШЧАНКА**.

У Анастасіі двое ўжо амаль дарослых дзяцей, яны ходзяць у падлеткавыя групы Нацыянальнай школы прыгажосці. І мама (па прафесіі — інжынер-хімік) таксама вырашыла пайсці сюды вучыцца — уменню стыльна апранацца, прыгожа хадзіць па подыуме і свабодна адчуваць сабе перад фотакамерамі. На гэтым паказе яна — адна з мадэляў, якія прадстаўляюць калекцыю дызайнера Марыны Баніфацьевай.

— Не хочацца адставаць ад моладзі, — усміхаецца Анастасія. — Трэба быць прыкладам для сваіх дзяцей і ісці ў нагу з часам.

Суразмоўніца распавяла, што гэты паказ для яе не першы, але перад выхадам на подыум яна хвалюецца кожны раз:

Фота Аліны МАЗАВЕЦ.

— Мадэль дэманструе публіцы работу дызайнера, і ад яе шмат у чым залежыць, якой будзе ацэнка гледачоў.

— Як вы лічыце, нашым суайчыннікам важная мода ў паўсядзённым жыцці? Прасцей кажучы, беларусы модныя?

— Самае галоўнае, што мы — нацыя працавітая, умеем і любім вучыцца. Беларусы адказныя і старанныя. А значыць, усё ў нас атрымаецца, — пераканана Анастасія.

Адной з разыначак шоу стаў удзел у паказе мадэляў з Расійскай Федэрацыі 40+: арганізатары падкрэслілі, што мода (і прыгажосць як яе неад'емны складнік) не мае межаў не толькі геаграфічных, але і ўзроставых. У прынцыпе пра гэта мадэльеры і стылісты гавораць ужо не адно дзесяцігоддзе. Але толькі ў нашы дні няўхільная ісціна стала відавочная ўсім. І гэта вельмі каштоўна, адзначаюць удзельніцы паказу. А дызайнеры кажуць пра тое, што па-ранейшаму не зжыта меркаванне: перасякнуўшы мяжу 50-годдзя, жанчына ўжо зрабіла ў сваім жыцці ўсё, што магла. Між тым яе велізарны творчы патэнцыял застаецца нераскрыты. Але на подыуме сталыя жанчыны змяняюцца, дазваляюць сабе быць прыгожымі. І гэта неверагодна важна.

Падымаліся на подыум і зусім юныя мадэлі.

— Я не ставіла сабе мэту зрабіць дзіця мадэллю — мне проста хацелася, каб дачка стала менш сарамлівай, больш разняволенай. І разам з выкладчыкамі Нацыянальнай школы прыгажосці мы дамагліся гэтага, — кажа мама васьмігадовай Алісы. — Так, перад кожным паказам мамы звычайна вельмі хвалююцца, але гэта заўсёды акупляецца станоўчымі эмоцыямі дзяцей і бацькоў.

— А ты хвалюешся, Аліса?

— Не-а, — крыху саромеючыся, адказвае юная мадэль. Але на подыум выходзіць упэўнена, ідзе прыгожа і рашуча, спіну трымае прама і ўсміхаецца гледачам так, што ёй апладзіруюць. У яе вачах — усведамленне сваёй прыгажосці, такое важнае для кожнай прадстаўніцы прыгожага полу ў любым узросце.

ТРЭНДЫ І ТЭНДЭНЦЫІ

— Цэнтр моды сёння паказвае дзве калекцыі, — распавёў **вядучы мастак-мадэльер ААТ «Цэнтр моды» Антон ЯРОШЧЫК**. — Па-першае, мы дэманструем зімовую калекцыю — святочныя і паўсядзённыя мадэлі. Другая калекцыя подыумная з назвай «Паўночны вецер». Пакуль яна яшчэ практычна нідзе не дэманстравалася. Створана з выкарыстаннем натуральнага футра і трыкатажу. Працуючы над ёй, мы хацелі стварыць прыклад так званай павольнай моды — гэта значыць, моды па-за часам. Футравыя вырабы «жывуць» вельмі доўга, таму ўльтрамодных тэндэнцый пры выкарыстанні натуральнага футра звычайна вы не ўбачыце. Футравыя вобразы мы «разбавілі» вышыўкамі са стразаў, натхнёнымі нацыянальнымі беларускімі арнаментамі, выкарыстоўвалі натуральныя ніткі з утрыманнем воўны і шоўку, а таксама экалагічныя тканіны з экаполіэстэру і экашоўку. Гэтая калекцыя — не столькі пра надзённыя задачы моды, колькі пра моду як мастацтва: пра падачу, прыгажосць, вобразнасць.

Зрэшты, пра надзённыя задачы — «што б такога надзець вось прама зараз, каб выглядаць стыльна?» — дызайнеры ў рамках Christmas Fashion Show таксама падумалі. Такім чынам, што ж мы падгледзелі на паказе з таго, што можна перанесці з подыума ў паўсядзённае жыццё?

● **Шматслойнасць.** Гэта любімы аўтфіт многіх модніц. Але часта пад шматслойнасцю разумеюць толькі пінжак на топ або жакет на блузку. Або яшчэ адзін спосаб уцяпліцца халоднай зімой. Між тым у руках дызайнераў гэты трэнд дае магчымасць сабраць з, здавалася б, базавых рэчаў непаўторны вобраз. Спалучаючы рэчы розных фактур (часам на першы погляд неспалучальныя), фарміруючы пэўную каляровую гаму, ствараецца эклектычны, але пры гэтым цэласны вобраз. Напрыклад, на паказе можна было ўбачыць, як стыльна насіць атласны топ на белую блузку (і зразумець, як упісаць гэты не вельмі просты для абывацеля трэнд — топ на кашулю — у паўсядзённыя вобразы). А таксама натхніцца «правільнымі» фасонамі жаночых пінжакоў.

● **Розныя фактуры тканіны ў адным вырабе**

У прынцыпе гэты трэнд — лагічны працяг шматслойнасці. І асабліва эфектна ён быў прадэманстраваны ў калекцыі лёгкіх, нібыта бязважкіх святочных сукенак далікатных пастэльных тонаў. Фактура адной тканіны падкрэслівала вартасці другой: бліскучыя тканіны — найлепшы дадатак да матавых, дакладныя сілуэты выдатна спалучаюцца з «лятучымі» тканінамі. І, вядома, навагоднія ўборы — 2022 — гэта празрыстыя і напаўпразрыстыя тканіны, якія ствараюць смелыя і пры гэтым неверагодна жаноцкія вобразы. Нюдавыя тоны, якія пераважалі на подыуме, — крэмавыя, серабрыста-шэрыя, прыглушана-блакітныя.

● **Трыкатаж і спартыўны стыль**

Спартыўныя касцюмы ўпэўнена крочылі са спартзалаў на вуліцы — сёння гэта моднае штодзённае адзенне. Дызайнеры прапанавалі выбіраць іх як у актуальных крэмавых тонах, так і ў яркіх «кіслотных» — салатавым, ружовым, аранжавым. З дэталяў — вялікія накладныя кішэні, каўнер з зашпількай-маланкай, двухколернасць і геаметрыя.

● **Чорны**

Маленькая чорная сукенка — бессмяротная класіка, якая не старэе, бо кожны год паўстае новай, убіраючы ў сябе трэнды. На Christmas Fashion Show чорная сукенка была вырашана з дапамогай карункавых дэталяў, напаўпразрыстых уставак і далікатнага бляску стразаў — арыстакратычнага і ненадакучлівага.

● **Этна**

Улічваючы тэматыку паказу — адзінства народаў, аб'яднаных модай і прыгажосцю, — гэты трэнд быў чаканы. Тым больш што паказ прысвечаны Калядам з іх яркімі і самабытнымі народнымі традыцыямі. Акрамя таго, адна з мэт паказу — стварэнне святочнага настрою, а менавіта этнастыль дызайнеры называюць «стылем добрага настрою». Натуральныя «дыхальныя» тканіны, свабода рухаў, жаноцкі крой, кантрасная вышыўка, арнаменты і махра... Плюс сучасныя тэндэнцыі — асіметрыя, акцэнт на стан. Ці падыдуць такія мадэлі для таго, каб сысці з подыума ў штодзённасць? Зразумела, яны не для стрыманых офісных лукаў. Затое такая рэч лёгка стане яркім акцэнтам у вобразе выхаднога дня — «глыток свежага паветра» для стомленых ад мітусні мегаполіса гараджан.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.

Лёс чалавечы

Паэзія ў інтэр'еры вясковага жыцця

Калі часам у той ці іншай размове ўзнікае гаворка пра мізэрнае вясковае жыццё з пункту гледжання духоўнага, я ўспамінаю лёсы беларускіх пісьменнікаў, якія жылі ў маленькіх райцэнтрах альбо нават у звычайных вёсках. Адзін з іх — Іван ГУРБАН, чыя паэтычная кніга «Выбранае» толькі што ўбачыла свет у выдаўца Віктара Хурсіка.

«Крочаць дзеці. / Снег рыпіць: / — Нецікава стала жыць. / Я пякучы, / Як агонь, / А бяруць мяне ў далонь. / Хоць іскрыся, / Хоць іржавей, — / Не спалохаеш / Дзяцей! / Паляжаў бы / На дарозе, — / Гоніць прэч мяне / Бульдозер. / Бацька мой — / Сівы мароз / Лепш мяне сюды б / Не вёз! / Пад нагамі / Снег рыпіць: / — Невыносна стала жыць, / І таму ў сакавіку / Я растану, / Уцяку...» («Скарга»). Пачытаеш такую «скаргу» — і ўзнікае некаторае шкадаванне, што ў дзяцінстве не сустрэў гэтых сімпатычных радкоў. У іх жа — і настрой лютаўскіх коўзанняў на гары каля ракі, і захапленне бялюткім іскрыстым снегам, і прадчуванне вясенняга наступу на зімовых гаспадароў — лёд і снег...

Іван Гурбан нарадзіўся ў 1922 годзе ў вёсцы Юшавічы цяперашняга Нясвіжскага раёна. А вось першую кнігу вершаў, адрасаваных дзецям, выдаў у 1979 годзе, — «Чубаценькі будзільнік». Наклад яе склаў 79 000 экзэмпляраў. А затым былі яшчэ зборнікі «Пахі вясны» (40 000 экзэмпляраў) , «Калі ветрык спачывае» (таксама наклад роўны 40 000 экзэмпляраў)... Напісаў жа Іван Яфімавіч нашмат больш. Пісаў і вершы для дарослага чытача, сатырычныя творы. Толькі ў 1994 годзе, за пяць гадоў да сыходу з жыцця, вясковага паэта з Юшавіч прынялі ў Саюз пісьменнікаў Беларусі.

У прадмове да кнігі Анатоль Гурбан — сын паэта — вось што піша пра свайго бацьку: «...У пасляваенныя гады і да выхаду на пенсію працаваў краўцом, паляводам, загадчыкам магазіна, будаўніком, рабочым у меліярацыйнай арганізацыі. У 1964 — 1966 гадах працаваў старшынёй Юшавіцкага сельсавета. Што гэта былі за гады, добра ведаюць тыя, каму сёння 60–70 гадоў... Гэта быў перыяд, калі ўлада знішчала цэрквы, а ён верыў у Бога, быў камуністам і кожную нядзелю ездзіў у Нясвіжскую царкву на новым месцы... І ніхто з юшаўцаў не здаў яго. Потым быў загад ад аднаго з раённых кіраўнікоў залезці на страху Юшавіцкай царквы і знішчыць крыж. Ён не выканаў гэты загад і болей старшынёй сельсавета не працаваў... Таго, хто гэта зрабіў, праз пэўны прамежак часу ў лесе прыдушыла дрэвам. Насмерць...» І яшчэ: «Пісаць пачаў рана, яшчэ да вайны, у час вучобы ў польскай школе. А настаўнікам у яго быў вядомы ў будучым беларускі пісьменнік Пятро Бітэль. Ужо ў сталым узросце, будучы членам Саюза пісьменнікаў Беларусі, бацька марыў аб сустрэчы са сваім былым настаўнікам, аднак, на вялікі жаль, сустрэліся яны ўжо ў іншым свеце... Свой першы верш апублікаваў у майскім нумары часопіса «Работніца і сялянка» за 1949 год. Як казаў мне бацька, у яго радні быў яшчэ адзін паэт-пачатковец — Гірко, сын сястры яго маці. У трыццатыя гады яны жылі ў вёсцы Траянава Капыльскага раёна. Яшчэ не паспеўшы напісаць штосьці значнае, адразу ж трапіў у поле зроку ўлад як ненадзейны. Забралі проста са школы... Далейшы лёс яго невядомы...»

Акрамя паэтычнай дзялянкі, якую настойліва абраблялі таленавіты вясковы творца, Іван Яфімавіч выгадаваў разумных, працавітых дзяцей — Анатоля, Ларысу, Людмілу. Выраслі і ўнукі, якія ведаюць, кім быў іх дзед: праграмісты, філолаг, юрыст, вайсковец. Жывуць не толькі ў Беларусі, але і ў Расіі, Ірландыі. У зборніку «Выбранае» змешчаны пераклады вершаў Івана Гурбана на рускую мову — іх ажыццявіў унук Далер. Праўнучка Софія намалявала для зборніка партрэт свайго прашчура. Моцны беларускі род!

А ў завяршэнне — слова самому Івану Гурбану: *«Кажуць, што душа не памірае, / Не гарыць, не тоне ў вадзе, / Мы не бачым, а яна жывая / Прылятае ў госці да людзей. / Можа быць, і праўда прылятае / Да свайго ранейшага жытла, / Ды відаць, не кожная, а тая, / Што ў жыцці бязгрэшную была»*. І — нізкі паклон дзецям, унукам, праўнукам, якія памятаюць па Івана Гурбана і паспрыялі нараджэнню сапраўднага кніжнага помніка вясковаму беларускаму паэту з Нясвіжскай старонкі.

Мікола БЕРЛЕЖ.

ООО «Юридическая компания Аспект» проводит третьи повторные ТОРГИ в форме открытого аукциона по продаже имущества ликвидируемого юридического лица – ОАО «Механизированная строительная колонна № 205»

№ лота	Наименование лота
1	Комплекс имущества, включающий: 1. Капитальное строение «Инженерный корпус», инв. № 429, инв. № в ЕГРНИ 500/С-29059, общей площадью 295 кв. м, по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, 15. Назначение – здание специализированное иного назначения. Стоимость – 97 584,00 руб. 2. Капитальное строение «Склад-навес металлический, инв. № 425, инв. № в ЕГРНИ 500/С-28791, общей площадью 43 кв. м, по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, 15. Назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического обеспечения. Стоимость – 11 001,00 руб. 3. Капитальное строение «Склад», инв. № 424, инв. № в ЕГРНИ 500/С-29061, общей площадью 178 кв. м, по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, 15. Назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического обеспечения. Стоимость – 63 213,00 руб. 4. Капитальное строение «Склад № 2», инв. № 426, инв. № в ЕГРНИ № 500/С-29060, общей площадью 120 кв. м, по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, 15. Назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического обеспечения. Стоимость – 45 714,00 руб. 5. Капитальное строение «Открытый склад № 3», инв. № 427, инв. № в ЕГРНИ 500/С-29057, общей площадью 334 кв. м, по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, 15. Назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического обеспечения. Стоимость – 109 098,00 руб. 6. «Временный склад для хранения строительных материалов», инв. № 991, общей площадью 144 кв. м, по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, 15. Стоимость – 31 464,00 руб. 7. «Навес на УПП», инв. № 1001, общей площадью 109 кв. м, по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, 15. Стоимость – 20 862,00 руб. 8. «Навес над пилорамой», инв. № 927, общей площадью 15 кв. м, по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, 15. Стоимость – 2 793,00 руб. 9. «Навес пристройка к складу № 3», инв. № 1016, общей площадью 271 кв. м, по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, 15. Стоимость – 68 628,00 руб. 10. «Рельсовые пути», инв. № 930, по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, 15. Стоимость – 285,00 руб. 11. «Сушильный блок», инв. № 842, общей площадью 63 кв. м, по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, 15 (незарегистрированный объект недвижимости). Стоимость – 24 225,00 руб. 12. «Мастерская (участок оцилиндровки)», инв. № б/н, по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, 15 (не зарегистрированный объект недвижимости). Стоимость – 27 189,00 руб. 13. «КТП-250 кВА», инв. № 662. Стоимость – 997,50 руб. 14. «Пожарная сигнализация», инв. № 851. Стоимость – 117,44 руб. 15. «Электролиния на УПП», инв. № 1033. Стоимость – 225,67 руб. Капитальные строения и другие объекты, входящие в лот № 1, расположены на земельном участке площадью 0,622 га с кадастровым № 500000000004000186, предоставленном на праве постоянного пользования для эксплуатации и обслуживания производственных зданий, складских помещений и растворно-бетонного узла в промузле Колядичи. Ограничений в использовании и обременений земельным сервитутом земельный участок № 500000000004000186 не имеет

Начальная цена за лот № 1 с учетом НДС 20 %, руб. – 503 396,62 руб.
Шаг торгов (5 %), руб. – 25 169,83 руб.
Задаток для участия в торгах (10 %), руб. – 50 339,66 руб.

№ лота	Наименование лота	Начальная цена за лот с учетом НДС 20 %, руб.	Шаг торгов (5 %), руб.	Задаток для участия в торгах (10 %), руб.
2	Грузовой автомобиль ГАЗ 33021	1 157,33	57,87	115,73
3	Грузовой автомобиль МАЗ 5336А5-320	6 976,80	348,84	697,68
4	Самосвал МАZ 5551	5 171,04	258,55	517,10
5	АТС N КР12Х-М/RUB, инв. № 1115	9,32	0,47	0,93
6	Биотуалет «Туалетная кабина «Стандарт», инв. № 1116	132,90	6,65	13,29
7	Биотуалет «Туалетная кабина «Стандарт», инв. № 1095	132,90	6,65	13,29
8	Бытовка, инв. № 1122	401,37	20,07	40,14
9	Бытовка 5.76*2,4*2,5, инв. № 1118	602,06	30,10	60,21
10	Вертикально-сверлильный станок, инв. № 410	501,15	25,06	50,11
11	Вертикально-фрезерный станок, инв. № 589	618,80	30,94	61,88
12	Вибратор (наконечник и эл. привод), инв. № 1112	25,31	1,27	2,53
13	Генератор FGT 3501 BSB VG SE, инв. № 1049	612,67	30,63	61,27
14	Здание мобильн. МК 7м, инв. № 626	601,92	30,10	60,19
15	Измеритель влажности матер. ВИМС-2.12-Б, инв. № 1005	297,96	14,90	29,80
16	Копировальный аппарат PANASONIK, инв. № 917	68,95	3,45	6,89
17	Лазерный нивелир с маятн. компенсат., инв. № 1108	56,72	2,84	5,67
18	Лебедка RCD-500 E21 (ЛЭК-500) 500 кг 220В с канатом 30 м, инв. № 1138	124,96	6,25	12,50
19	Насос «Дренажник» 220/12 в комплекте с поплавком, инв. № 1136	76,59	3,83	7,66
20	Нивелир лазерный линейный BOSC GLL 3-80, инв. № 1137	265,39	13,27	26,54
21	Обдирочно-шлифовальн. станок, инв. № 266	152,19	7,61	15,22
22	Принтер XEROX лазерный, инв. № 901	74,54	3,73	7,45
23	Тепловентилятор МАКАР ТВ-9К, инв. № 1078	72,26	3,61	7,23
24	Тиски слесарные, инв. № 712	12,89	0,64	1,29
25	Токарно-винторезный станок, инв. № 170	1 163,14	58,16	116,31
26	Факсимильный аппарат, инв. № 405	61,56	3,08	6,16
27	Факсимильный аппарат PANASONIC KX-FL403RU, инв. № 1031	61,56	3,08	6,16
28	Копировальный аппарат Kyocera, инв. № 1042	50,51	2,53	5,05
29	Мобильный телефон NOKIA, инв. № 908	7,73	0,39	0,77
30	ПЭВМ Prestigio, инв. № 1083	25,66	1,28	2,57
31	Факсовый аппарат Panasonic KX-FT934RU, инв. № 988	10,26	0,51	1,03
32	Алкометр Lion, инв. № 1046	277,02	13,85	27,70
33	Копировальный аппарат XEROX WC 3220MFP, инв. № 1091	11,38	0,57	1,14
34	Леса строительные, инв. № 1132, 20 секц.	1 285,87	64,29	128,59
35	Леса строительные, инв. № 1133, 20 секц.	1 285,87	64,29	128,59
36	Леса строительные, инв. № 1129, 3 секц.	192,88	9,64	19,29

*Торги назначены на **17.01.2022 г. в 10.30** по адресу: **г. Минск, ул. Тимирязева, д. 65, оф. 401, холл (4-й этаж)**. Срок приема заявок, внесения задатка для участия в торгах – до **14.01.2022 г.** включительно. Заявки принимаются организатором торгов по месту проведения торгов в рабочие дни с 9.00 до 17.30 (по пятницам – до 16.30)*

Продавец	**ОАО «Механизированная строительная колонна № 205»**
Организатор торгов	**ООО «Юридическая компания Аспект»**
Реквизиты для оплаты задатка	**Бенефициар – ОАО «Механизированная строительная колонна № 205», р/с BY75AKBB30126690600045400000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, БИК AKBBBY2X, УНП 100056336**

Условия торгов:

• к участию в торгах допускаются лица, заключившие с организатором торгов договор о задатке, внесшие денежный задаток, представившие организатору торгов в установленный срок заявление на участие в торгах с приложением всех необходимых документов и зарегистрированные в соответствующем журнале;
• лицо, желающее участвовать в торгах, представляет с заявлением оригинал платежного документа с отметкой банка об исполнении, подтверждающего внесение на текущий (расчетный) счет ПРОДАВЦА, указанный в настоящем извещении, суммы задатка. При личном обращении заявитель (представитель) предъявляет оригинал документа, удостоверяющего личность. Дополнительно организатору торгов представляются:
- юридическим лицом: копия последней редакции устава и свидетельства о государственной регистрации вместе с их подлинниками для заверения копий организатором аукциона, доверенность на представителя (если юридическое лицо представляет не руководитель) или документ, подтверждающий полномочия руководителя юридического лица;
- юридическим лицом, иной организацией (нерезидентом Республики Беларусь): копии учредительных документов вместе с выпиской из торгового реестра страны их учреждения (выданной не ранее шести месяцев до даты подачи заявления) или иным равнозначным доказательством юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения, доверенность на своего представителя, легализованные в установленном порядке, с нотариально удостоверенным переводом на русский язык;
- ИП: копия свидетельства о государственной регистрации и подлинник для заверения копии организатором аукциона;
- представителем гражданина Республики Беларусь, ИП: нотариально удостоверенная доверенность;
- представителем иностранного физического лица, индивидуального предпринимателя (нерезидентов Республики Беларусь): легализованная в установленном порядке доверенность с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык;
• победителем признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену;
• договор купли-продажи подлежит подписанию в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения торгов;
• победителю торгов, выразившему согласие на заключение договора купли-продажи, задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах за приобретаемый предмет торгов;
• в случае, если торги признаны несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет аукциона продается претенденту на покупку, при его согласии, по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) процентов;
• победитель/единственный участник торгов, выразивший согласие на покупку предмет торгов (лота), по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) процентов, оплачивает цену предмета торгов (лота) за вычетом суммы внесенного задатка, в течение 10 (десяти) календарных дней с момента заключения договора купли-продажи; иной срок для оплаты предмета торгов (лота) может быть определен соглашением сторон

Объявления о предыдущих торгах опубликованы в печатном номере газеты «Звязда» за 01.10.2021 г., 16.11.2021 г., 10.12.2021 г.

Получить дополнительную информацию о порядке проведения торгов можно по телефонам: +375 (44) 5986627, 8 (017) 3480699 в рабочие дни с 9.00 до 17.30 (по пятницам – до 16.30). Ознакомиться с предметом торгов возможно по месту нахождения имущества, после предварительного согласования по тел. +375 (44) 5986627.

ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Белгипроторг»

Лот	Наименование	Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб.	Задаток, бел. руб.	Шаг аукциона, бел. руб.
1	Имущество, согласно списку № 1: https://docs.google.com/document/d/1D5H25LhPrnUpxQK0tYNBrJAJbGTOK81P/edit?usp=sharing&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true	1011,96	101,20	50,60
2	Имущество, согласно списку № 2: https://docs.google.com/document/d/1JrCB6oNF8Sixl8hsgkrP3xlhNs1GyhP/edit?usp=sharing&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true	396,36	39,64	19,82
3	Имущество, согласно списку № 3: https://docs.google.com/document/d/1Dt7ha5hvzSvBuvywB67OP3jiRdTWYd4-/edit?usp=sharing&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true	360,72	36,07	18,04

В отношении вышеуказанного имущества проводятся первые повторные торги. Цена снижена на 10 %. Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 231 (29600) от 30.11.2021, 6 стр.

Местонахождение лотов: 220089, г. Минск, ул. Железнодорожная, д. 31, корпус 1, комн. 307

Дата и время проведения торгов	**20 января 2022 года в 12.00 (регистрация – с 11.30 до 11.55) по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127**
Срок приема заявлений и внесения суммы задатка	**С 10.00 10 января 2022 года по 16.00 18 января 2022 года**

Условия для участия в торгах:
1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: задаток для участия в торгах по Лоту ___, ОАО «Белгипроторг», проводимых 20.01.2022.
2. Заявления на участие и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2 экземплярах, копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта; копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой (220113, г. Минск, а/я 524) или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления являются дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов).
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста – 7,5 % от конечной цены предмета торгов.**
Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 5 (пяти) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 10 (десяти) рабочих дней со дня проведения торгов.
6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться в разделе «Ликвидация» на сайте https://orgtorg.by/info/.
7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. Контактное лицо для осмотра предмета торгов – Андрей, тел. +375293042560.
8. Организация и проведение аукциона осуществляются на основании норм Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16

Информация о продавце	**ОАО «Белгипроторг» в лице ликвидатора – ООО «Партнёр-Консультант», тел. +375293489225 (220089, г. Минск, ул. Железнодорожная, д. 31, корпус 1, ком. 307, УНП 100026596)**
Организатор аукциона	**ООО «Фрондера» 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127: ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg**

ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Вилейский райагросервис»

Лот	Наименование	Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб.	Задаток, бел. руб.	Шаг аукциона, бел. руб.
1	Ср-во энергр.ун. УЭС М50-22 ОВ-5шаблов	58320,00	5832,00	2916,00

В отношении вышеуказанного имущества проводятся первые повторные торги. Стоимость снижена на 10 %. Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 230 (29599) от 27.11.2021, стр. 6

Местонахождение лота: Минская обл., Вилейский р-н, д. Осиповичи

Дата и время проведения торгов	**20 января 2022 года в 14.30 (регистрация с 14.00 до 14.25) по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127**
Срок приема заявлений и внесения суммы задатка	**С 10.00 10 января 2022 года по 16.00 18 января 2022 года**

Условия для участия в торгах:
1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: Задаток для участия в торгах по Лоту 1, ОАО «Вилейский райагросервис», проводимых 20.01.2022.
2. Заявления на участие и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2-х экземплярах, копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта; копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр.лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр.лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой (220113, г. Минск, а/я 524) или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов).
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста – 7,5 % от конечной цены предмета торгов.**
Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 10 (десяти) календарных дней с момента подписания протокола о результатах торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 15 (пятнадцати) календарных дней со дня проведения торгов.
6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться в разделе «Ликвидация» на сайте https://orgtorg.by/info/.
7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. Контактное лицо для осмотра предмета торгов – Чеслав, тел. +3752999999112.
8. Организация и проведение аукциона осуществляются на основании норм Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16

Информация о продавце	**ОАО «Вилейский райагросервис» в лице ликвидатора – ООО «Партнёр-Консультант», тел.: +375295767715, +375172552928 (222416, г. Вилейка, ул. 1 Мая 105, УНП 600010756)**
Организатор аукциона	**ООО «Фрондера» 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127: ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg**

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

АВЕН. У панядзелак лепш за ўсё будзе ўдавацца тое, што вы робіце па сваёй ініцыятыве. У аўторак не захапляйцеся, фанатызм пазбавіць вас аб'ектыўнасці і ў выніку прывядзе да памылкі. У сераду будуць прырастаць грошы і маёмасць. У чацвер чакаецца шмат сустрэч, званкоў і перапіскі, паспрабуйце не пакідаць нявырашаных пытанняў — у пятніцу яны затармозяцца, а потым наогул адменяцца або перанясуцца на нявызначаны тэрмін. У нядзелю ламайце звычкі ў дзелавой сферы і пераходзьце «на новыя рэйкі».

ЦЯЛЕЦ. Не імкніцеся да новых дасягненняў у матэрыяльнай сферы. Замест гэтага карысна паглыбіцца ў сябе і паразважаць над тым, што вас не задавальняе і чаму. У аўторак будзеце паводзіць сябе незвычайна. Захочацца паэксперыментаваць са знешнасцю. У нядзелю вы апыняцеся ў экстрэмальнай сітуацыі. Яна прымусіць вас перагледзець сваё жыццё і штосьці ў ім змяніць.

БЛІЗНЯТЫ. Да пятніцы аддайце як мага больш часу сустрэчам, перагаворам, вучобе, адпраўце ўсе запланаваныя пасылкі і грашовыя пераводы, здайце справаздачы. У пятніцу вы не прасунецеся ў гэтых справах ні на крок. А з суботы ўсё пачне адмяняцца і пераносіцца, пасылкі будуць губляцца ў дарозе, у перагаворах другі бок дасць задні ход.

РАК. Тыдзень пачнецца дынамічна. Не панікуйце і не спрабуйце ўсё паспець. У аўторак здарыцца штосьці незапланаванае. У сераду пабудзьце з людзьмі. У чацвер захочацца адзіноты. З пятніцы будуць праблемы з атрыманнем інфармацыі, якая датычыцца фінансаў. У нядзелю штосьці зменіцца ў дзелавых ці асабістых адносінах.

ЛЕЎ. Пачатак тыдня будзе афарбаваны ў казачныя і рамантычныя тоны. Гэта дапаможа вам не проста ўспомніць, што на парозе — стары Новы год, але і ўнутрана настроіцца на яго. У вас ажыве чаканне навагодніх цудаў. У сераду магчымае напружанне на рабоце, але чацвер і пятніцу вы праведзяце з сябрамі або на вялікім мерапрыемстве. У нядзелю вам трэба будзе кардынальна перагледзець свой падыход да здароўя, рэжыму дня, харчавання.

ДЗЕВА. У пачатку тыдня будзеце настроеныя на спакойнае жыццё і звыклыя заняткі. Але ў сераду і чацвер апыняцеся вельмі-вельмі блізка да сур'ёзных змен або непрыемнасцяў. Не спяшайцеся нешта рабіць. З пятніцы сітуацыя зменіцца і пачне адкочвацца назад. Можна лічыць, што бяда абмінула. Але яна яшчэ нагадае пра сябе ў лютым. Але вы ўжо ведаеце, у чым можа быць праблема, і ў вас ёсць час падрыхтавацца.

ШАЛІ. Вам не рэкамендуецца сыходзіцца з новымі людзьмі, запрашаць гасцей, пра штосьці дамаўляцца і купляць рэчы ў дом. Замест гэтага трэба засяродзіцца на аднаўленні сямейнай гармоніі. Тыдзень ідэальны для таго, каб убачыць, што ў сям'і штосьці пайшло не так, і пашукаць спосабы гэта выправіць. Магчыма, выпраўленні і пераробкі запатрабуе і само жыллё. Укладваць у гэта грошы цяпер не рэкамендуецца, а плануйце будучыя ўдасканаленні цалкам можна.

СКАРПІЁН. Галоўнымі тэмамі тыдня будуць кароткія паездкі і перамяшчэнні па горадзе, сустрэчы, званкі, перапіска, а калі ваша работа ці прыватныя справы таго патрабуюць, то яшчэ гандаль, абмен і пасрэдніцтва. Усе важныя сустрэчы трэба завяршыць да пятніцы, бо потым там пачнуць мяняцца ўмовы і ўсё давядзецца пачынаць нанава. У нядзелю наступіць пераломны момант у адносінах з кімсьці з блізкага атачэння.

СТРАЛЕЦ. Вы ўвесь тыдзень будзеце энергічныя і дзейныя — можа, па ўнутраным стане, а можа, жыццё прымусіць, падкінуўшы тэрміновыя справы. У большасці выпадкаў вы будзеце дзейнічаць паспяхова. Але ў аўторак і сераду ёсць рызыка захапіцца, трапіць у эйфарыю і з-за гэтага дрэнна пралічыць свае дзеянні. Вас падманам ці праз алкаголь могуць прымусіць рабіць тое, чаго рабіць не трэба. Павышаная рызыка траўмы з-за вашага ці нечага іншага нецвярозага стану.

КАЗЯРОГ. У панядзелак і аўторак будзеце ў летуценным настроі. Вас будзе лёгка разжаліць сентыментальнай гісторыяй. У штодзённых справах вам будзе добра ўдавацца хаваць свае намеры, таму займайцеся тым, што трэба зрабіць незаўважна. У другой палове тыдня самай важнай стане нядзеля. Гэта лёсавызначальны дзень, з-за падзей якога ў вас адбудзецца сур'ёзная змена ў жыцці або ў характары.

ВАДАЛІЙ. У пачатку тыдня можаце выдатна выступіць на дзелавой нарадзе ці стаць вядучым святочнага мерапрыемства. У сераду і чацвер вы будзеце перажываць і чакаць непрыемных навін. Яны не прыйдуць — усё паступова заціхне. Можаце лічыць, што навальніца мінула. Гэтая тэма яшчэ ўспыве ў лютым. З пятніцы можна вяртацца да старых спраў і штосьці выпраўляць у іх.

РЫБЫ. Увесь тыдзень будзе спадарожнічаць поспех у вашых персанальных справах. А вось адносіны з сябрамі, членамі каманды, у групе, дзе вы знаходзіцеся, часова пагоршацца. У аўторак будзеце адчуваць натхненне. Гэта добра, каб атрымаць ад жыцця прыемнасць, парадавацца гэтаму дню, але дрэнна, калі трэба штосьці рабіць і атрымліваць канкрэтныя вынікі.

СЁННЯ

Месяц

Маладзік 3 студзеня. Месяц у сузор'і Рыб.

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	9.27	17.05	7.38
Віцебск —	9.23	16.47	7.24
Магілёў —	9.17	16.54	7.37
Гомель —	9.05	16.59	7.54
Гродна —	9.41	17.21	7.40
Брэст —	9.33	17.30	7.57

Імяніны

Пр. *Клаўдзіі, Мікалая, Сяргея, Яўгеніі.*

К. ТРЫ КАРАЛІ, ці СВЯТОЕ БОГАЯЎЛЕННЕ. *Андрэя, Балтазара, Каспара, Мельхіёра.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



Даты Падзеі Людзі

6 СТУДЗЕНЯ

У краіне

1912 год — нарадзіўся Яўген Максімавіч Палосін, беларускі акцёр, народны артыст СССР, народны артыст БССР. Працаваў у абласных драмтэатрах Беларусі: Гомельскім, Брэсцкім, Магілёўскім, у 1949—1976 гадах — у Дзяржаўным рускім драматычным тэатры. Акцёр камедыйнага плана. Зняўся ў кінафільмах: «Несцерка», «Дзяўчынка шукае бацьку», «Анюціна дарога» і іншых.

1920 год — нарадзілася (в. Курсевічы Пастаўскага раёна) Ганна Іванаўна Маслоўская, Герой Савецкага Саюза. У Вялікую Айчынную вайну з 1941 года ў Чырвонай Арміі; трапіўшы ў акружэнне, наладзіла сувязь з партызанамі. У 1942 годзе па заданні падпольнай партыйнай арганізацыі ўладкавалася ў Паставах у швейную майстэрню, якая абслугоўвала гітлераўцаў. Збірала звесткі пра ворага. З яе дапамогай падпольшчыкі знішчылі фашысцкага генерала фон Цуга. З мая 1943 года ў партызанскім атрадзе імя Пархоменкі брыгады імя Варашылава. Удзельнічала ў разгроме фашысцкіх гарнізонаў у Залессі, Лынтупах, Камаях, у падрыве трох эшалонаў ворага; вынесла з поля бою 23 параненых партызанаў. Пасля вайны стала прыёмнай маці 15 сірот, бацькі якіх загінулі ад рук фашыстаў.

1952 год — нарадзіўся (в. Мхінічы Краснапольскага раёна) Юрый Пятровіч Астроўскі, беларускі вучоны ў галіне сардэчна-сасудзістай хірургіі, доктар медыцынскіх навук, прафесар, член-карэспандэнт НАН Беларусі, акадэмік НАН Беларусі. Аўтар навуковых прац па распрацоўцы арыгінальных канструкцый адна- і двухстворкавых штучных клапанаў сэрца, распрацоўцы агрэсіўных метадаў лячэння вострага каранарнага сіндрому і сардэчнай недастатковасці. Заслужаны ўрач Рэспублікі Беларусь. Двойчы лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі.

У свеце

1596 год — нарадзіўся Багдан Хмяльніцкі, гетман Войска Запарожскага, украінскі палкаводзец і дзяржаўны дзеяч.

1872 год — нарадзіўся Аляксандр Мікалаевіч Скрабін, рускі кампазітар і піяніст, наватар у галіне выразных сродкаў, які аказаў вялікі ўплыў на развіццё музычнай культуры XX стагоддзя.

1896 год — прэм'ера фільма «Прыбыццё цягніка на вакзал Ла-Сьёта» братоў Люм'ер. Нягледзячы на немудрагелістасць сюжэта (на экране дэманструецца ўсяго толькі прыпынак цягніка каля чыгуначнай платформы вакзала горада Ла-Сьёта і пасажыры, якія ідуць уздоўж вагонаў), фільм займеў шырокую вядомасць. Па сведчаннях (магчыма, моцна перабольшаных), першы паказ фільма выклікаў паніку сярод публікі, якая не была псіхалагічна гатовая ўспрыняць «ажыўшую» выяву цягніка, паказанага ў натуральную велічыню, які рухаецца на гледачоў.

1943 год — для асабовага складу Чырвонай Арміі ўведзены пагоны.

Так гаварыў...

АЛЕСЬ РАЗАНАЎ:

«Мы плацім за пазнанне нязнанаю цаной».

У сувязі са святам наступны нумар «Звязды» выйдзе ў аўторак, 11 студзеня.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27,

e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 67.

Нумар падпісаны ў 19.30

5 студзеня 2022 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12